беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

# НАША НІВА

№ 16 (54)
1 ліпеня 1996 г.
панядзелак

выходзіць у панядзелкі

раслад руху аўтобусаў

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

ТЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

# Люстрацыя па-беларуску

Сёньня Чэхія — адзіная пакуль краіна, дзе прыняты закон пра люстрацыю. Гэта значыць, што былым функцыянэрам камуністычнай партыі й супрацоўнікам палітычнага зыску забаронена займаць дзяржаўныя пасады, але дазволена выбарныя. У выніку — посткамуністы адсунуты на ўзбочыну грамадзкага жыцьця. Чэхія — адзіная з краінаў рэгіёну, дзе выбары апошняга часу не прывялі да ўлады людзей, якія нясуць адказнасьць за ранейшы рэжым.

У Беларусі праблема адказнасьці дагэтуль не пастаўленая на шырокае абмеркаваньне. Уласьцівыя ранейшаму рэжыму прыгнёт чалавечае асобы, бяспраўнасьць і татальная хлусьня кіраўніцтва дагэтуль не асуджаныя і таму працягваюць панаваць у нашым жыцьці. Больш за тое, зло, калі яно беспакаранае, прэтэндуе называцца дабром, хлусьня — праўдай, а татальны кантроль дзяржавы над чалавекам — свабодай.

*Праблемам люстрацыі прысьвечаныя матэрыялы 2-й старонкі.*



*Юры Хадыка:*

# «Калі мы станем на калені, яны ўсё адно будуць нас забіваць»

***Намесьнік старшыні Беларускага Народнага Фронту Юры Хадыка адказаў на пытаньні карэспандэнта «Нашай Нівы» Алега Дашкевіча:***



*«НН»: Якая, на Вашую думку, сёньняшняя сытуацыя ў краіне?*

Ю.Хадыка: Напружаная. Новы Вярхоўны Савет яшчэ не адчувае сваёй адказнасьці і ня мае волі, каб супрацьстаяць прэзыдэнцкаму валюнтарызму. Такі стан раздвоенасьці, калі ад ВС сыходзяць толькі імпульсы незадавальненьня, але не сыходзіць ніякай канструктыўнай праграмы, і характарызуе сёньняшнюю палітычную сытуацыю.

*«НН»: Ці не здаецца Вам, што яна падобная да той, што была ў 1989 годзе?*

Ю.Х.: Так, ёсьць адчуваньне няўпэўненасьці, магчымай небясьпекі, правалу ў наступны дзень, месяц. Хоць у 1989 годзе было больш спакойна, ня так жахліва. І тады адчувалася бездапаможнасьць улады, вычарпанасьць псыхалягічных і матэрыяльных рэсурсаў нацыі. Але тады людзі жылі чаканьнем зьменаў і былі гатовыя ператрываць цяжкасьці. А сёньня гэтага ўжо няма, і сытуацыя можа павярнуцца ў вельмі драматычны бок.

*«НН»: Як з 1989 году зьмяніўся БНФ?*

Ю.Х.: Тады Фронт быў адзінай арганізацыяй, якая ўзьняла лёзунгі змаганьня з рэжымам, і гэта натхняла ўсіх удзельнікаў, нягледзячы на магчымыя рэпрэсіі. Сёньня сытуацыя

*Працяг на старонцы 3.*

## Фэномэн маладога пакаленьня

Інтэрвію кс. Люка Парэйта, галоўнага рэдактара францускага часопіса «Верыць сёньня» пра тое, як бацькі мусяць перадаваць веру сваім дзецям сёньня. *Старонка 16.*

*Славамір Адамовіч*



# «Пятая страфа»

***Паэт Славамір Адамовіч, які сядзіць у сьледчым ізалятары КГБ за верш «Убей президента», апублікаваны ў віцебскай газэце «Выбар», сьпніў сухую галадоўку, прыняў адваката і пачаў падрыхтоўку да суда. Тымчасам рэдакцыя «НН» атрымала ад С.Адамовіча ягоныя вершы і занатоўкі, напісаныя ў рэанімацыйным боксе шпіталя КГБ. Гэтыя тэксты друкуюцца на 13-й старонцы нумара.***

* * *

**Кавалак чорнага хлеба,**
**нашага хлеба з нашага жыта**
**давай пераломім на дзьве палавіны —**
**табе і мне — і абмочым у мёд,**
**яшчэ не загуслы, яшчэ з пахам воску**
**і нашых прастораў.**
**Давай падсілкуемся, дружа,**
**насыцім давай нашы целы**
**высокай энэргіяй пушчы**
**і гарызанталямі поля.**
**Пасьля стольскіх дзён паміраньня**
**пахнуць дажджом навальнічным**
**рамонкі і мята ў букеце,**
**які нам прынесла інкогніта**
**жанчына з газэты «Імя».**

*23.06.96*
*Шпіталь КГБ*

## навіны 1-м сказам

навіны 1-м сказам

**КАНСТЫТУЦЫЯ.** Вярхоўная Рада Ўкраіны ўхваліла новую Канстытуцыю — першую пасьля распаду СССР. Дзяржаўным сымбалем у гэтай Канстытуцыі прызнаны нацыянальны жоўта-блакітны сьцяг, а адзінай дзяржаўнай мовай — украінская.

**СЬЦЯГ.** Пяць дзён — да мінулае суботы — правісеў бел-чырвона-белы сьцяг на даху 13-павярховага будынка інтэрната БДУ. Кажуць, што ён быў вышэйшы за сьцяг на адміністрацыі прэзыдэнта.

**КАНСТЫТУЦЫЯ-2.** Вярхоўны Савет Беларусі канчаткова выкасаваў з заканадаўства краіны ўсе акты, дзе згадваліся бел-чырвона-белы сьцяг і герб Пагоня, на карысьць сымболікі БССР, якая, дарэчы, адрозьніваецца ад той, якую А.Лукашэнка летась выносіў на рэфэрэндум.

**ДАЛЯР.** На адзін даляр у дзень на Зямлі жыве 1,23 млрд. чалавек, альбо кожны пяты, — сьцьвярджае ў сваім апошнім дакладзе «Аб беднасьці» Сусьветны Банк.

**ЗАПУСК.** Паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці на 256 прадпрыемствах горада да жніўня будзе зьліквідавана 2.700 рабочых месцаў.

**ПАРТЫІ.** Аб'яднаная Грамадзянская Партыя і партыя Зялёны Мір вырашылі правесьці аб'яднаўчы зьезд сёлета восеньню.

**ЧАСОПІСЫ.** У гэтыя дні пад Варшавай працуе чарговая міжнародная нарада прадстаўнікоў рэдакцыяў «тоўстых часопісаў» культурніцкай арыентацыі. Традыцыйна ў нарадзе ўдзельнічае прадстаўнік «Нашай Нівы».

**ЛЕТА.** Наступны нумар «Нашае Нівы» выйдзе 14-га ліпеня.

# Падарыць люстэрка

Сёньняшняя дзяржаўная палітыка ў Беларусі настолькі абсурдная, што не зьнікае адчуваньне — альбо пакутліва зьнікне аб'ект гэтай палітыкі, альбо сыйдуць з арэны яе рэалізатары. Гэтыя людзі настолькі супрацьпаставілі сябе беларускаму грамадзтву, што слаба верыцца ў пасьпяховую трансфармацыю сёньняшняга рэжыму да такой ступені, каб ён стаў хоць неяк адэкватным культурным, эканамічным, сацыяльным рэаліям Беларусі. Такім чынам, паўстае пытаньне — што будзе заўтра, г.зн. тады, калі нарэшце надыдзе час канструктыўнае працы.

Бо, занізіўшы ўсе ацэначныя плянкі, такія рэаліі беларускага жыцьця як эканамічную шызафрэнію, міжнародную ізаляцыю, парушэньні правоў чалавека можна вызначыць як памылкі ўраду. Але Беларусь сутыкаецца найперш зь сьвядомым парушэньнем законаў і Канстытуцыі з боку вышэйшых дзяржаўных інстанцыяў. Такім чынам, паўстае пытаньне адказнасьці.

Гэта вельмі дыскусійнае пытаньне ў сёньняшняй Сярэдняй Эўропе. У Польшчы тыя інтэлектуалы, якіх прадстаўляе Адам Міхнік, абгрунтоўваюць канцэпцыю «Даць шанец». Сутнасьць яе — у стварэньні магчымасьцяў для прыняцьця функцыянэрамі старога злачыннага рэжыму новых правілаў парлямэнцкай гульні. Але ў кожнай з краінаў Сярэдняй Эўропы ва ўзаемаадносінах грамадзтва з былымі партыйнымі бонзамі склаўся свой спэцыфічны варыянт паводзінаў.

Крывавая разьвязка ў Румыніі прывяла да таго, што былыя камуністычныя кіраўнікі былі адсунутыя ад дзяржаўнае ўлады, але заняліся бізнэсам, выкарыстоўваючы сродкі партыі, якія захоўваліся на Захадзе: сыны і браты Чаўшэску сёньня адны з найбуйнейшых румынскіх бізнэсмэнаў.

Чэхія сталася адзінай краінаю, дзе быў прыняты закон пра люстрацыю, паводле якога былым функцыянэрам камуністычнай партыі й супрацоўнікам палітычнага зыску забаронена займаць дзяржаўныя пасады, але дазволена выбарныя. У выніку —посткамуністы адсунуты на ўзбочыну грамадзкага жыцьця. Чэхія — адзіная з краінаў рэгіёну, дзе выбары апошняга часу не прывялі да ўлады людзей, якія нясуць адказнасьць за ранейшы рэжым.

Кантрастам тут выглядае Баўгарыя, дзе сёньня ва ўладзе — учорашнія камсамольцы, а былы галоўны плоўдзіўскі камсамолец — прэм'ер-міністар краіны. Спробы правядзеньня ў Баўгарыі «сацыяльна-сацыялістычнай» палітыкі прывялі да дэфіцыту хлеба й бэнзыну, да грамадзкіх хваляваньняў.

Сытуацыя кіраваньня эканомікай і сацыяльнымі працэсамі з боку «новых-старых» функцыянэраў ужо стала прадметам аналізу спэцыялістаў у галіне эканомікі й сацыялёгіі. Будапэшцкая дасьледніцкая група правяла маніторынг у краінах Сярэдняй Эўропы, высьвятляючы ступень залежнасьці эканамічнай і палітычнай сытуацыі ад фактару ўплыву старой намэнклятуры. Высьвятляецца, што нават калі гэтыя людзі дэкляруюць рынкавыя й дэмакратычныя ідэалы, яны ўсё адно прыўносяць ва ўладу свае старыя карпаратыўныя сувязі, прынцыпы, мысьленьне. У выніку —рэформы замаруджваюцца, за кошт чаго адбываецца мэтавае ўзбагачэньне старой намэнклятуры, а гэтым жа часам —падзеньне ўзроўню жыцьця асноўнае масы насельніцтва. Вось чаму закон пра люстрацыю — гэта эфэктыўны юрыдычны сродак самааховы грамадзтва ад монстраў злачынных рэжымаў.

Хто ж у заўтрашняй Беларусі мусіць падпасьці пад закон пра люстрацыю? За апошнія два гады камуністычная намэнклятура была канчаткова разгромленая, яна ўжо не ўяўляе сабою нейкай маналітнай сілы. Найбольш агрэсіўныя яе прадстаўнікі лягічна перайшлі ў структуры сёньняшняга аўтарытарнага рэжыму. Вось хто заўтра стане «ўчорашнім» — супрацоўнікі Адміністрацыі прэзыдэнта й вэртыкаль, гэта значыць, тыя людзі, якія не падлягалі падчас свайго прызначэньня нават тым сьціплым працэдурам дэмакратычных выбараў, якія заканадаўча існуюць у Беларусі. Гэтыя людзі былі асабіста прызначаныя пантакратарам, колам гэтых людзей распрацоўваліся й рэалізоўваліся самыя абсурдныя й антыканстытуцыйныя памкненьні рэжыму. Яны самі сталі часткаю рэжыму. Вось чаму іх павінен чакаць Закон пра люстрацыю.

Пачатак абмеркаваньня беларускім грамадзтвам праблемы адказнасьці будзе тоесны акту падараваньня гэтым людзям люстэрка — хто захоча, убачыць там сваё сёньняшняе аблічча.

**АЛЕГ ДЗЯРНОВІЧ**

# Віртуальная Рэальнасьць

Аднойчы, едучы ў тралейбусе, я стаў сьведкам размовы двух падлеткаў, у якіх на джынсоўках красавалі вялікія бел-чырвона-белыя значкі. Адзін у другога спытаўся: «Калі б ты стаў прэзыдэнтам, што б ты зрабіў з ... ?» Зрэшты, ня мае значэньня з кім, галоўнае — прынцып. Як сёньня беларусы МРОЯЦЬ будучыню сваёй краіны?

Ужо было шмат сказана пра тое, што Беларусь — з тых дзяржаваў, якія зусім неспадзявана для сябе апынуліся перад фактам уласнае незалежнасьці. Наша краіна, бадай, адзіная з былых савецкіх рэспублік, кіраўніцтва якой доўгі час упарта не жадала ўспрымаць незалежнасьць як сапраўднасьць. Таму да 1994 году вольная Беларусь сапраўды была адной з найсвабаднейшых дзяржаваў сьвету, бо ніхто, ні ўлады, ні жыхары, не рабілі асабліва рэзкіх захадаў: «масы» жылі сваёй савецкай «віртуальнай рэальнасьцю», «адраджэнцы» — сваёй, а заўжды невялікая частка прагматыкаў выкарыстоўвала фантастычныя магчымасьці, якія «надараюцца раз на стагодзьдзе».

Вынік першых прэзыдэнцкіх выбараў справакаваў выбух у грамадзкіх адносінах беларусаў: вялікая частка насельніцтва «на сваёй скуры» адчула, чым абарочваецца «ўпіхваньне» аднога з варыянтаў віртуальнай рэальнасьці — савецкага — у сапраўднасьць. Ужо агульнапрынята, што гэтыя людзі 14 траўня 1995 заклалі падмурак станаўленьня новай беларускай нацыі. Таксама відавочна, што гэты мільён зь лішкам людзей увесь час папаўняецца й кшталтуецца ў канкрэтныя формы. Дзьве віртуальныя рэальнасьці — «савецкая» й «незалежная» —паступова ўраўнаважваюцца ў сьведамасьці беларускага грамадзтва, а колькасьць прагматыкаў не павялічваецца: людзьмі кіруюць лёгіка і... мроі. Таму, мадэлюючы будучыню Беларусі, трэба сыходзіць з двух вэктараў, паміж якімі разьвіваецца найноўшая беларуская сытуацыя. Рэальная будучыня — паміж імі, але не пасяродку. Праўда, яшчэ год таму «залатая сярэдзіна» вымалёўвалася досыць выразна — варыянт «млявацякучасьці», балота. Але галоўны «Вынік» першых прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі досыць рашуча яго адсек.

Такім чынам, вэктар першы. Ён скіраваны да савецкасьці, якая зь «віртуальнай рэальнасьці» зноў пераўтвараецца ў сапраўднасьць — гратэскавую, несалідную, але жорсткую, у якой мы ўжо ня зможам ні пісаць, ні чытаць пра яе, якая будзе карыкатурай на разнастайныя дэспатычныя рэжымы. Праўда, нясьмешнай карыкатурай, бо ахвяры, няхай нешматлікія, будуць сапраўднымі.

Вэктар другі. Ён імкнецца да Беларусі незалежнай, культурна адроджанай, дэмакратычнай, заможнай etc.

Мэханізм рэалізацыі першага варыянту цалкам зразумелы: мы ведаем тэорыю, мы назіраем практыку ў дачыненьні да нашых умоваў. У нас адбываецца звычайны рэванш савецкіх рамантыкаў і прагматыкаў, першы рэванш у іхнім жыцьці. Яны помсьцяць «дэмакратам» кожны за сваё. Хто за «развал Саюзу», хто за сваё жабрацтва, хто за згубленыя магчымасьці «кармленьня», хто за нерэалізаваную парткар'еру... Зразумела, пэўная частка прагматыкаў нікому ня помсьціць, а выкарыстоўвае гэтую сытуацыю для рэалізацыі сваіх праектаў. Урэшце, асабіста мне іхні рэванш ня вельмі цікавы, ён трывіяльны й шэры. Уявім, што чырвоныя рэваншысты «ісьсякнут», ці то без дапамогі з Усходу, ці то праз сваё няўмельства, ці праз звычайную сацыяльную «смуту» — варыянтаў безьліч. Таму сёньня мне вельмі хацелася б даведацца ў палітыкаў, якія ўвасабляюць супрацьлеглы вэктар



разьвіцьця Беларусі, пра іхнія захады пасьля прыходу да ўлады.

На жаль, атрымаць шчыры адказ, прынамсі, на магнітную стужку, немагчыма. Я прадбачу варыянты адказаў, якія будуць разгледжаныя праз прызму недасканалага, а таму небясьпечнага для ЎСІХ грамадзянаў, Крымінальнага Кодэксу РБ. Але пытаньні застаюцца. Што тыя ці іншыя дэмакраты зьбіраюцца рабіць з тымі тысячамі й тысячамі службоўцаў усіх масьцяў і рангаў, якія сьледам за сваімі начальнікамі зьверху ўжо шматкроць парушылі дзясяткі артыкулаў адміністрацыйнага й крымінальнага кодэксаў: усялякія начальнікі «апарнякоў», РАУСаў, судоў? Што яны зьбіраюцца рабіць з КГБ увогуле, і з тысячамі ягоных служак паасобку? Што яны зьбіраюцца рабіць з начальнікамі разнастайных спэцпадразьдзяленьняў і іхнімі падначаленымі, якія выконвалі проціпраўныя загады?

Па ўсёй Беларусі сядзяць такія мацёрыя «кадры», за якімі такія даўгія «хвасты» разнастайных злоўжываньняў, яны ўтвараюць такую «банду», што мне цяжка ўявіць, якім чынам дэмакраты, што спадзяюцца на ўладу, не дадуць сябе заглынуць. Бо гутарка ідзе пра сотні тысяч пэрсонаў.

Асабіста я ня чуў пакуль ні ад адной апазыцыйнай арганізацыі прынцыпу «пакараньня ўсіх вінаватых». Альбо яго няма, альбо лічыцца, што час для абнародаваньня шчэ не сасьпеў. А шкада. Памойму, часу катастрафічна бракуе. Можа так здарыцца, што яны вельмі доўга ня будуць мець магчымасьці раскрыць той прынцып. Альбо наадварот, трэба будзе тэрмінова дзейнічаць. У кожным разе, прынцып кіраваньня, якім карыстаўся Станіслаў Шушкевіч — спагадлівасьць і талерантнасьць, у цяперашняй Беларусі абсалютна «завальны». Талерантнасьць, напэўна, была дарэчы ў 1991-м, калі рэжым рухнуў пад уласным цяжарам. Тады ўсе былыя савецкія рэспублікі распачыналі НОВАЕ жыцьцё. Кожны атрымаў, што хацеў, мы — чырвоны рэванш. «Чырвоны» паводле традыцыйнай клясыфікацыі. Насамрэч ён колеру твані. Цяпер час «маленькіх людзей», якія залезуць да сябе пад балотны корч, як толькі вецер задзьме ў іншы бок. І будуць там сядзець, і глядзець на вяртаньне «буржуяў», а «буржуі» будуць распавядаць ім, як трэба правільна жыць, а тыя ў сябе пад карчом будуць трымаць дулю, і зноў спрабаваць падладзіцца пад новых...

Не, варыянту балотнай «залатой сярэдзіны» сапраўды ўжо не йснуе. Ён перайшоў у якасьць «віртуальнай рэальнасьці». Па-мойму, шмат у якіх беларускіх палітыкаў ён карыстаецца вялікай папулярнасьцю. Яны застаюцца прагматыкамі пакуль ідзецца пра іх канкрэтна, а калі гаворка заходзіць аб прынцыпах дзеяньня, яны «выпадаюць» ва ўласную «віртуальную рэальнасьць». Тымчасам сёньня грамадзяне Беларусі фармуюць на вуліцах вельмі канкрэтныя прынцыпы.

«Верцякальшчыкі» свой выбар у гэтым жыцьці зрабілі даўно, а «віртуальшчыкам» ад дэмакратаў трэба хутчэй акрэсьлівацца — з кім яны, і, галоўнае, ЯК яны. А йнакш — пад корч.

**СЕВЯРЫН КВЯТКОЎСКІ**

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА

| | |
|---|---|
| заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991 | |
| заснавальнік і выдавец | Павал Жук |
| рэдактар | Сяргей Дубавец |
| адказны сакратар | Алег Дзярновіч |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| навіны | Уладзімер Бараніч |
| рэдактар дадатку "Інфарматар" | Андрэй Лапцёнак |
| макет | Віктар Корзун |
| дызайн і вёрстка | Лявон Раманчык |
| набор | Тацяна Чуйвід |
| стыліст | Антон Кузьміч |
| карэктура | Сяргей Сматрычэнка |
| пры ўдзеле | Сяргея Шупы |
| прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі (тэл. 56-94-36) | Зьміцер Бартосік |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ**
**220123 Менск, а/с 71** **Тэл./факс 236-76-75**
**Падпісны індэкс 63125**

# Субота, дзень сёмы. Гледзячы на твары...

Сапраўды, усё на тварах напісана: сьветлыя думкі, цёмныя думкі, адсутнасьць думак...

У суботу пад моцным летнім дажджом, які быў так патрэбны расьлінам і якога, на жаль, не было тады ў Берасьці — а там чарговая засуха, бяда — у Менску сабралася каля дзесяці тысячаў чалавек, якія разумеюць, што, гаворачы словамі Брэхта, «сука, якая нарадзіла вырадка, ізноў цяжарная». Дзесяць тысячаў твараў: разумных, сьветлых, спакойных, заклапочаных... Нашых. Калі цяжка, калі кепска ў галаве ад гэтых скрыпучых, немадуляваных радыёгаласоў «истинно белорусских патриотов», ад іх стогнаў і завываньняў пра «экстремистов» ды «шабаш» — тады варта выйсьці ў суботу, дзень сёмы, пад летні дождж — як у царкву, да міласэрнага Бога, да гэтых дзесяці тысячаў твараў...

На тварах усё напісана. Я пільна ўглядаюся: гэта дэпутаты Народнай Рады Ўкраіны, гэта тыя самыя УНА-УНСОўцы, якіх так баяцца нашыя расейскія палкоўнікі.

Юры Тыма — яму каля трыццаці, жывыя карыя вочы, каротка падстрыжаны, жвавы ў рухах — тыповы запароскі казак. Гаворыць разумна, удумліва, узрадаваўся, калі прысутныя журналісты (гэта прэсавая канфэрэнцыя) папрасілі яго гаварыць па-ўкраінску.

Яраслаў Ілясэвіч — каля паўвеку за плячыма, твар хударлявы, інтэлігентны, аколены невялікай сівой барадой, высокі лоб, шэрыя выразныя вочы.

Пан Тыма падкрэсьлена прагматычны, ён гаворыць пра рэаліі сёньняшняга дня, пра расейскія выбары, пра стаўленьне ўкраінскіх уладаў да беларускага прэзыдэнта і г.д. Пан Ілясэвіч уражвае своеасаблівым рамантызмам, любоўю да Айчыны і добрым веданьнем ваеннае справы — былы афіцэр, а сёньня працаўнік штабу УНА-УНСО.

«Нацыяналіст, — кажа ён, — гэта чалавек зь вялікай літары. Гэта той, хто дзеля Радзімы кінецца з гранатай на танк. Адзін нацыяналіст варты роты, а рота — палка. Калі жонка Рамана Шукевіча, галаўкама Ўкраінскай паўстанцкай арміі папракнула яго, што ён па паўгода не бывае дома, і, можа, завёў другую жонку, то ён адказаў: «Наталко! — а яе Наталкай звалі, —кахаю цябе больш за жыцьцё, але ж Украіну — яшчэ больш...»

Юры Тыма: «Паколькі тым сямі ўкраінскім грамадзянам, што ўтрымліваюцца тут у турме, дасюль ня дадзенае пэўнае абвінавачваньне, сьледзтва практычна не вядзецца і, з нашых зьвестак, суда ў бліжэйшы час ня будзе, мы лічым іх ваеннапалоннымі. Таму на нашу просьбу прэзыдэнт Ічкерыі Зэлімхан Яндарбіеў прапануе расейцам — а Беларусь жа саюзьніца Расеі — абмяняць на сямёх расейскіх палонных. Паглядзім, які будзе адказ вашага прэзыдэнта...» — журналісты прыгаломшана маўчаць.

«Пытаюцца, хто нас сюды запрасіў? — гаворыць пан Ілясэвіч. —На сьвята запрашаюць. На гора — не. На хаўтуры не запрашаюць. Калі ў Беларусі гора — мы прыехалі падзяліць яго з вамі. Украіна ніколі не пакіне Беларусь сам-насам зь бядой...»

Юры Тыма: «УНА-УНСО створана на выпадак, калі, барані Бог, давядзецца бараніць Украіну ад вонкавага ворага або якога стыхійнага ліха. Украінскае войска, як і ваша, пасьля распаду саюзу парасьцягнулі ды параскралі. Ня тое з УНА-УНСО — мы баяздольныя, Украіна можа на нас спадзявацца».

Дзеля Ўкраіны яны здольныя галадаваць, сядзець у турмах, паміраць... Гэтыя людзі ня будуць будаваць на чужыя грошы шматпавярховых катэджаў, купляць «мэрсэдэсы», шыкаваць на пікніках — гэта бачна. Ім ня трэба хаваць вочы за цёмнымі акулярамі. Яны не гавораць штампамі.

Вось чаму іх так баяцца нашы расейскія палкоўнікі. Вось чаму ліюцца на іх гэтыя цэбры бруду. Вось чаму ў турму да іх не пускаюць консула, але вядуць Азаронка...

УНА-УНСО здольная, у разе патрэбы, процістаяць тэрору. Ці здольныя бараніцца ад тэрору мы, беларусы?

Яраслаў Ілясэвіч: «Людзі прыходзяць да нас, як у апошнюю інстанцыю. Калі няма сілы разарваць зачараванае кола хлусьні, калі ня могуць даць рады цынічнаму нахабству, прыходзяць і гавораць: «Дапамажыце, хлопцы!» І мы дапамагаем».

**НАТАЛЬЛЯ БАБІНА**

# Адраджэньне, якога не жадаеш

Ёсьць падзеі, разьвіцьцё якіх ідзе, як сьнежная лавіна. Адна падзея цягне за сабой другую, другая — трэцюю і гэтак далей. Але такія падзеі ў большасьці сваёй адбываюцца паводле закону: «Тое, што добра пачынаецца — кепска скончыцца. Тое, што пачынаецца кепска, сканчаецца яшчэ горш».

Адраджэньне Беларусі, якое пачалося ў час перабудовы, ішло зь вялікімі цяжкасьцямі. Адраджэньне БССР пайшло хуткімі крокамі. Цяпер зьявілася яшчэ адна прыкмета гэтага працэсу.

Спачатку ў нас адрадзілася БССРаўская сымболіка. Гэта пацягнула за сабой шэраг абмежаваньняў палітычных правоў і свабодаў. Потым зьявіліся першыя і, на жаль, не апошнія палітвязьні. Цяпер да нас прыйшоў тамвыдат.

Сьпярша зьявіліся ўлёткі ад імя менскае філіі УНА-УНСО. А потым — газэта «Моладзь змагаецца!» з кіеўскім кантактным адрасам.

Самвыдат у нас не зьнікаў ніколі. Нават падчас улады Шушкевіча існавала газэта «Баста!» Але гэта было наша — менш радыкальнае і больш разважлівае. Сёньняшняя нелегальная прэса паўтарае традыцыі 70-х: захаваўся «памяркоўна-філязофскі» самвыдат часоў Шушкевіча, зьявіўся больш экстрэмісцкі тамвыдат. Як інакш, калі не экстрэмісцкай, трэба называць газэту, якая зьмясьціла на сваіх старонках спосаб прыгатаваньня «кактэйлю Молатава»?

Адметная рыса тамвыдату — выдатнае веданьне таго, што адбываецца ў нас. У кіеўскай газэце зьмешчаны матэрыялы пра падзеі 30 траўня, прычым напісана ўсё ад імя ўдзельніка акцыі і «маладзёжнаю моваю» — з шчырым ужываньнем расейскага мату. Парады юнакам, як паводзіць сябе пры сутычцы зь міліцыяй, што рабіць на мітынгу і г.д. Усё гэта з такім веданьнем нашай сытуацыі, што нават дзіўна робіцца — чаму ўсе кажуць пра «парваныя сувязі»?

Зьяўленьне тамвыдату, прычым экстрэмісцкага — гэта яшчэ адно непажаданае адраджэньне. Гэта сьведчыць аб тым, што ў Беларусі ня ўсё добра з свабодай слова. Дый з палітычнай сытуацыяй таксама. Інакш каму б спатрэбіліся такія газэты?

Зьдзіўляе толькі адно: «Экспарт рэвалюцыі» ідзе з памяркоўнай Украіны ў рэвалюцыйную Беларусь, а не наадварот, як было, напрыклад, у часы Парыскай Камуны: з рэвалюцыйнай Францыі ў памяркоўныя краіны.

Перавага Беларусі над Расеяй у тым, што ў Беларусі няма Сібіру, куды высылаюць звычайна выдаўцоў такіх газэт. Але гэтая праблема ўжо амаль вырашана канфэдэрацыяй. Засталося толькі далучыць да супольнасьці Кіеў.

Цікава, ці зьнікне «тамвыдат», калі пачнецца «адраджэньне адраджэньня»? Таго адраджэньня, якое скончылася, так і не пасьпеўшы пачацца...

**СЯРГЕЙ ПУЛЬША**

# «Калі мы станем на калені, яны ўсё адно будуць нас забіваць»

Працяг са старонкі 1.

нашмат больш складаная, бо заявак на палітычнае волевыяўленьне, на лідарства стала шмат. Многія арганізацыі дэклярююць сваё памкненьне дапамагчы грамадзтву знайсьці выйсьце з крызысу, хоць аб'ектыўна і сёньня гэта ўсё яшчэ змаганьне з той самай посткамуністычнай (тады — проста камуністычнай) намэнклятурай, зь яе ідэалёгіяй, якая камянём ляжыць на грудзях беларускага грамадзтва. Але арганізацыяў гэтых столькі, што ў людзей вочы разьбягаюцца ад разнастайнасьці праграмаў. Адсутнасьць адзінай глебы для аб'яднаньня — гэта тое, што адрозьнівае найноўшую сытуацыю ў горшы бок.

*«НН»: Ёсьць думка, што цяжка было паразумецца на гэтай глебе зь Зянонам Пазьняком. Нібы яго прэтэнзія быць манапалістам наісьціну, нацыянальную ідэю была занадта моцная.*

Ю.Х.: Многія палітычныя лідары могуць мець асабістыя крыўды на Пазьняка. Што да нацыянальнай ідэі, то манаполія на яе, натуральна, належала БНФ. І кожны нармальны палітык мусіў з гэтым мірыцца. Бо менавіта БНФ першы сфармуляваў і разьвіў гэтую ідэю, а таму яна яму і належыць. Можна толькі дапамагаць яе разьвіваць, а не прэтэндаваць з выклікам. Практыка паказала, што ніхто ня змог зрабіць лепш.

*«НН»: Згадаем франты ў краінах Балтыі, якія перамаглі і натуральным чынам распаліся, альбо ўкраінскі Рух, які актыўна супрацоўнічаў спачатку з Краўчуком, былым ідэолягам ЦК, а цяпер — з Кучмам. І ў краінах Балтыі і ва Ўкраіне нацыянальная ідэя — адзяржаўленая. І там непараўнальна іншае становішча з мовай, з правамі чалавека.*

Ю.Х.: Папракаць нас у неканструктыўнасьці няма падставаў. Вось вы кажаце, што Рух супрацоўнічаў з Краўчуком, але ў такім сэнсе і БНФ супрацоўнічаў у мінулым Вярхоўным Савеце. Прапаноўваліся законы аб сымболіцы, грамадзянстве, дэкларацыя аб незалежнасьці...

*«НН»: Датуль, пакуль на чале Вярхоўнага Савету, як працяг згаданае дзейнасьці Фронту, ня стаў Шушкевіч. Зьявілася пэўная абалонка, форма, якую трэба было напампоўваць зьместам. І вось тут чамусьці...*

Ю.Х.: ... вы думаеце, што памылка Фронту ў тым, што ён не падтрымваў ва ўсім Шушкевіча? А ці мог Фронт гэта рабіць? Ці не з пазыцыі Шушкевіча, якую ён заняў у 1992 годзе, вынікае сёньняшні крызыс? Той год быў крытычны для пэрспэктываў беларускай дэмакратыі, і адказнасьць за правал рэфэрэндуму ляжыць на Шушкевічы. Фронт зрабіў усё: сабраў подпісы, пераадолеў супраціўленьне нават камуністычнай цэнтральнай выбарчай камісіі, якая прызнала, што ўсё было зроблена законна і чыста (тады яны яшчэ баяліся ісьці на адкрытую падтасоўку). І што Шушкевіч? Праз паўгода пасьля таго, як Фронт праводзіць яго на пасаду старшыні ВС, ён абвяшчае, што фармулёўка пытаньня рэфэрэндуму бессэнсоўная. Калі так, няхай ён паглядзіць на фармулёўкі рэфэрэндуму 1995 году і таго, які Лукашэнка зьбіраецца правесьці сёлета.

Там было пытаньне з сэнсам. А ён яшчэ падчас збору подпісаў абвяшчае, што гэта ўсё памылка, а потым распускае ВС на паўгода за два дні да таго, як цэнтральная выбарчая камісія перадала праверaныя подпісныя лісты. За гэтыя паўгода зьбіраецца каманда — Лукашэнка, Булахаў і іншыя — і бярэ на сябе ўсю гэтую брудную працу, якую не маглі ўзяць Кебіч і ягоныя прыхільнікі, бо яны былі адкрытыя камуністы. А гэтая публіка, нібы пракамуністычная, а насамрэч проста эгаістычная ў сваім імкненьні да ўлады. Адказнасьць за тое, што гаварыў Булахаў з трыбуны ВС, будзе ляжаць на ім да канца яго жыцьця. Ім удалося праваліць рэфэрэндум — адзіны нармальны шанец бяз бойкі, бяз крызысу, у межах Канстытуцыі зьмяніць гэтую ўладу. Магчыма, гэта быў адзіны варыянт беларускага шляху дэмакратызацыі, нашай «сьпеўнай» або «аксамітнай» рэвалюцыі.

*«НН»: Пасьля таго, як рэфэрэндум быў правалены, апазыцыя абвясьціла, што ня будзе працаваць у нелегітымным ВС. Але праз нейкі час яна ўся зноў там зьявілася...*

Ю.Х.: Абвясьцілі пра тое, што гэты ВС згубіў сваю легітымнасьць, бо парушыў закон, які сам і прыняў. Апазыцыя сапраўды пагражала, што пакіне ВС, але гэта на Шушкевіча не падзейнічала. Шушкевіч мог выратаваць сытуацыю, нават пры такім шалёным супрацьдзеяньні групоўкі Лукашэнкі. Гэта была яго грубая памылка, якая прывяла да парыву сувязі паміж ім і апазыцыяй.

*«НН»: Якія, на Вашу думку, найбольшыя памылкі БНФ?*

Ю.Х.: Утварыўшы парлямэнцкую апазыцыю, мы недаацанілі магчымасьці падтрымкі вулічнай дэмакратыі. Яна была вельмі дзейсная падчас антыкамуністычных выступленьняў увосень 1991 году. І тыя посьпехі — прыняцьце сымболікі, дэклярацыі аб незалежнасьці і г.д. — мы мелі непасрэдна пры падтрымцы народу на плошчы Незалежнасьці. А пазьней нашай парлямэнцкай фракцыі здалося, што мы можам дамагчыся пэўных посьпехаў шляхам фракцыйных перамоваў, і падтрымка вуліцы аслабела. Гэта адразу прывяло да нэгатыўных вынікаў. Бо калі б пры разглядзе рэфэрэндуму на плошчы стаяла 20 тысяч, то не выступаў бы так Булахаў, па-іншаму паводзіў бы сябе Шушкевіч.

Асабіста я ўвесь час казаў, што нельга рабіць выгляд, быццам мы ўжо перамаглі камуністычную сыстэму і жывем ва ўмовах парлямэнцкай дэмакратычнай рэспублікі. Я перакананы, што адмаўляцца ад мітынговай палітычнай дубінкі нельга. З-за гэтага мы прахлопалі рэфэрэндум, ухапіўшыся ў 95-м годзе за магчымасьць павялічыць сваё прадстаўніцтва ў ВС. Мы не супрацьпаставілі рэфэрэндуму ніякай масавай палітычнай дзейнасьці. Шкала, што толькі ў 96-м Фронт узяўся за тую працу, якую мусіў рабіць раней. Мітынгі і шэсьці вясны 96-га паказваюць, што нішто ня можа прымусіць гэтую ўладу адмовіцца ад сваіх крокаў. Толькі, калі народ выходзіць...

*«НН»: А якая сёньня сувязь Фронту з вуліцай?*

Ю.Х.: Гэтая сувязь напоўнілася новым зьместам. У параўнаньні з 90-м і 91-м гадамі ў акцыях стала браць удзел значна больш моладзі. Гэта напаўняе нас вераю ў тое, што нешта атрымаецца.

*«НН»: Існуе меркаваньне, што моладзь выводзіць на вуліцы не БНФ, а Лукашэнка — ад праціўнага.*

Ю.Х.: Магу згадзіцца толькі з тым, што нам дапамагае выводзіць людзей на вуліцу Лукашэнка. А ідзе моладзь пад сьцягамі БНФ. Вось, да прыкладу, 1 траўня, калі Фронт сказаў, што ня будзе ўдзельнічаць. Паспрабавалі сацыял-дэмакраты. Ну і што, выйшаў народ? 15 сакавіка паспрабавалі бяз Фронту. І што, моладзь выйшла? Ці гэта параўнальна з 26-м красавіка ці з 30-м траўня, калі людзі ня толькі выйшлі, але й падставілі свае шыі пад дубінкі. Хіба маладыя не гатовыя ісьці за БНФ, калі іх дзясяткамі, сотнямі за гэта садзяць? Наш абявязак выцягваць гэтых хлопцаў і абараняць іх.

*«НН»: Што можа перашкодзіць Фронту аб'яднаць людзей?*

Ю.Х.: Калі Фронт перастаў бы адчуваць духоўныя патрэбы моладзі... Мы ўвесь час думаем пра гэта. Самае галоўнае — не згубіць сувязі з моладзьдзю. Мы разумеем, што яе падтрымка —гэта ня дар Божы, якім мы можам распараджацца, што за яе трэба змагацца, адпавядаць сваімі паводзінамі чаканьням моладзі, што мы і робім. Маладым абрыдла глядзець на тую сэрвільную палітыку, якую дэманструюць так званыя цэнтрысцкія партыі. Так званыя, бо цэнтрызмам у нас сёньня называюць беспрынцыповасьць. А Фронт займае выразную, прынцыповую, небаязьлівую пазыцыю. Мы абвясьцілі, што мы супраць палітыкі Лукашэнкі, бо гэта — здрада нацыянальным інтарэсам, і мы будзем змагацца супраць гэтага, як бы ён нас ні палохаў.

*«НН»: Зянон Пазьняк цяпер у эміграцыі. Але сытуацыя вымагае прысутнасьці лідара тут. Калі сытуацыя ў краіне раптам павернецца такім чынам, што спатрэбіцца замена Лукашэнкі, то ці ёсьць у БНФ такая замена?*

Ю.Х.: Лідары не выбіраюцца, яны ствараюцца самім жыцьцём. Пазьняк застанецца лідарам БНФ як у Менску, так і па-за межамі. Мы ня будзем гадаваць новага лідара. У нас дастаткова арыгінальных людзей, і кожны на сваім месцы. Праблема ў тым, што перамога такога лідара на бліжэйшых прэзыдэнцкіх выбарах — пад пытаньнем. Яна магчымая толькі тады, калі больш за 50 працэнтаў людзей у Беларусі будуць падтрымваць БНФ. Пакуль жа мы ня зможам абраць Пазьняка, бо ў яго, як і ў камуністаў, вельмі вялікі адмоўны электарат — нехта рашуча за, а нехта рашуча супраць. І таму праблема — як рацыянальна дзейнічаць у гэтай сытуацыі — праз год, праз тры гады. На якой кандыдатуры спыніцца, каб гэта было на карысьць для Беларусі? Такую памылку, як на мінулых выбарах, мы паўтараць ня будзем. Тады мы вылучылі Пазьняка, вылучылі Шушкевіча (пры ўсёй нэгатыўнай ацэнцы ягонае дзейнасьці, гэта была другая прыймальная кандыдатура для дэмакратычных сілаў). Калі б Пазьняк зьняў кандыдатуру, галасы пайшлі б да Шушкевіча, калі б Шушкевіч зьняў, — частка галасоў пайшла б да Пазьняка. Такой сытуацыі больш дапускаць нельга. Трэба шукаць кандыдатуру і рабіць стаўку на чалавека — нестопрацэнтовага бээнэфаўца. Я думаю, што гэта мусіць быць не адзін чалавек, а можа два ці тры. Адна арганізацыя цалкам стварыць імідж такому чалавеку ня можа.

*«НН»: Яшчэ летась здавалася, што Вы задужа мяккі, лагодны чалавек, а сёньня, пасьля «Валадаркі», пасьля дваццаці пяці дзён галадоўкі, здаецца, што Вы зьмяніліся.*

Ю.Х.: Ваша ўражаньне ад маёй мяккасьці ўсё ж перавялічанае, бо я стаў прыхільнік БНФ, а БНФ у сваёй палітыцы заўсёды быў радыкальным. Нашы патрабаваньні йшлі далей, чым у астатніх партыяў. Што да маіх апошніх выказваньняў, то яны тлумачацца сытуацыяй, якая склалася гэтай вясною. Калі б не было гэтага зьбіваньня соцень маладых хлопцаў, каб не было грубага парушэньня элемэнтарных нормаў права, каб не было гэтага нахабнага выкліку, забароны нават таго, што дазвалялася яшчэ ў 88-м годзе... Я быў асуджаны яшчэ за першы «Чарнобыльскі шлях», але ж тады мы прайшлі! Тады была камуністычная ўлада, на якой і ляжала адказнасьць за Чарнобыль, ад якой мы патрабавалі праўды, і яна, тая ўлада, ня біла людзей. А сёньня нахабная ўлада ў асобе нейкага Ярмошына забараняе шэсьце. Выйшла 50 тыс. чалавек, ім загароджваюць рух міліцыяй. Чаму? Хіба ж мы каго зьбілі, згвалцілі, нешта разьбілі? Навошта столькі грубае сілы? Гэта спроба паставіць людзей на калені! І я б перастаў сябе паважаць, калі б не пайшоў проста на гэтую сілу, я — стары чалавек. Гэта значыць, што я паставіў бы сябе ў такі стан, у які яны ставілі нашых бацькоў. Дык лепш я памру! Я ж ведаю, што, паставіўшы на калені, яны ўсё адно будуць забіваць. Дык лепей няхай яны мяне заб'юць на вуліцы...

*«НН»: Мне даводзілася чуць ад людзей самых розных, ад Шушкевіча да Кебіча, што з Хадыкам прасьцей знайсьці агульную мову. Ці разьлічваеце Вы, БНФ, на падтрымку гэтых людзей у сёньняшняй сытуацыі?*

Ю.Х.: Я, вядома, удзячны тым, хто так лічыць. Я і сапраўды заўсёды імкнуўся не перабольшваць асабістых амбіцыяў, каб дасягнуць найбольш шырокага аб'яднаньня дэмакратычных сілаў. Наша сталая небясьпека — гэта апынуцца ізаляванымі, аслабленымі тымчасам, калі жыцьцё патрабуе агульных намаганьняў.

*«НН»: Гледзячы на паседжаньні ўправы БНФ, у мяне складаецца ўражаньне, што Фронт баіцца выходзіць на новыя правілы гульні. Нібы яму прасьцей гуляць паводле тых старых правілаў. Ці гэта памылковае ўражаньне?*

Ю.Х.: Псыхалягічна Вы маеце рацыю, так у кожнай партыі, і БНФ не выключэньне ў гэтым сэнсе. Заўсёды лягчэй дзейнічаць паводле нейкага стэрэатыпу, паводле нейкіх узораў. Я магу тут толькі заўважыць, што на восеньскіх выбарах, калі Лукашэнка пагражаў зьліквідаваць прадстаўнічую ўладу, і ўсе разумелі, што трэба правесьці выбары, чым бы яны ня скончыліся, Фронт даволі плённа ўзаемадзейнічаў з рознымі партыямі. І Аб'яднаная Грамадзянская Партыя і Сацыял-Дэмакратычны Саюз павінны быць удзячныя Фронту. Мы на іх не крыўдуем, што нашы не прайшлі. Наш электарат больш палітычна заангажаваны і перадаецца, калі мы яго пра гэта просім, а іх электарат нам не перадаецца, колькі б яны не заклікалі. Так што мы ўжо робім крокі, якія традыцыйна лічацца неўласьцівымі для БНФ. Хаця гэтае пытаньне ізноў будзе стаяць увосень, бо засталося яшчэ шэсьцьдзесят зь нечым акругаў, і ня выключана, што БНФ будзе выстаўляць максімум сваіх кандыдатаў.

*«НН»: Значыць, Фронт будзе пераглядаць сваю пазыцыю? Ці можна казаць пра нейкія рэформы стылю?*

Ю.Х.: Вядома. З аднаго боку, мы працягнем узаемадзеяньне зь іншымі партыямі, але пры патрэбе будзем радыкалізавацца ў параўнаньні з іх мяккім курсам. Я мяркую, што з той сытуацыі, якая складаецца, мы павінны выносіць карысьць ня толькі для саюзьнікаў. І калі палітычнае жыцьцё ў краіне будзе надалей абвастрацца, то трэба будзе йсьці самастойна, без саюзьнікаў. Можа скласьціся так, што людзі захочуць абраць радыкала. Тады самастойная палітыка Фронту прынясе свае дывідэнды.

*«НН»: Тымчасам з Фронту сышлі многія, хто яго пачынаў, прыкладам Анцулевіч, Івашкевіч і шэраг іншых асобаў.*

Ю.Х.: Так, я пра гэта моцна шкадую. Гэтыя людзі ня толькі шмат зрабілі, але і могуць шмат зрабіць. І таму мы будзем іх падтрымваць, калі яны захочуць вылучацца. Яны ж і цяпер займаюцца вельмі прагрэсіўнай дзейнасьцю... Канфлікт адбыўся на чацьвертым зьезьдзе, паміж першым і другім турамі галасаваньня ў 95-м годзе. Вясной мы выступалі без саюзьнікаў, што нас у значнай ступені ізалявала, затым былі пратэсты часткі фронтаўцаў, і мы памянялі тактыку, цяпер, можа быць, зноў давядзецца вярнуцца да яе. Але звышзадача, каб гэтыя людзі, фронтаўцы паводле перакананьняў, далёка ад яго не адрываліся, якія б разыходжаньні ў нас ні былі. Мы ўвесь час падтрымліваем зь імі кантакты. Я глыбока перакананы: іх губляць нельга, гэта таленавітыя людзі. Гэта той капітал, якім нельга раскідвацца...



Міжнародны агляд

# Няшчырыя ўсьмешкі і гібель народаў

Прававерныя рванулі чарговую бомбу. Гэтым разам на амэрыканскай базе ў Дахране загінулі 23 жаўнеры. Хто здолеў падмануць пільнасьць? Маглі ліванскія шыіты, барацьбіты з амэрыканскім сатаною. Калісьці ў 1982 годзе іхні камікадзэ ў Бэйруце падарваў аж 250 францускіх дэсантнікаў. Мог палестынскі «Хамас», што сваімі атакамі перакрэсьліў міратворцу і інтэлектуалу Шымону Пэрэсу шанцы на перамогу на выбарах. Маглі амазонкі з адмысловага жаночага батальену палкоўніка Кадафі. Можна згадаць, як умела лівійцы пахавалі пад недаломкамі «Боінга» шатляндзкую вёсачку Локерзбі. Маглі іракцы. Ёсьць яшчэ Судан, запаведнік ісламскага таталітарызму, дзе пасьпяхова працягваецца генацыд хрысьціянізаваных нэграў на поўдні краіны. А яшчэ Сірыя, Альжыр, Іран...

Што й казаць, слова «тэрарыст» шмат у каго асацыюецца з прыметнікам «ісламскі». Між тым, гэтая зьява распаўсюджана як у хрысьціянскім, гэтак, нават, і ў будыйскім сьвеце. Аднак жа, не ва ўсіх краінах людзі з жахам выкідаюць праз фортку аўтобуса выпадкова забыты кімсьці пакет, каб ня стаць ахвярамі нечае чарговае адчайнае спробы зьвярнуць на сябе ўвагу.

Тэрарызм — гэта расплата за веліч краіны, бо вялікі заўседы ўціскае малога, бо ягоныя празьмерныя апэтыты змушаюць яго лезьці ўсюды: grandeur oblige (ЗША, Расея, Францыя, Вялікабрытанія, Індыя). Тэрарызм плюндруе посткаляніяльныя або шматнацыянальныя (абое рабое) краіны, якія не жадаюць развітвацца з аскепкамі былых імпэрыяў (Расея — Чачэнія, Францыя — Корсіка, Гішпанія — Краіна Баскаў, Папуа-Новая Гвінэя — Бугенвіль, Інданэзія — Тымор, Шры-Ланка — Тамілы). Імігранты, тэмпэрамэнтныя жыхары поўдня, трапіўшы ў краіны, дзе не знаходзяць рэалізацыі іхні палкі нораў, саграюцца гульнёй у вайну (Нямеччына, Францыя). Мафіёзнасьць эканомікі — натуральны чыньнік неспакою (Італія, Калюмбія, Расея).

Тэрор — гэта ня толькі кроў і сьлёзы, падманутая рамантыка маладосьці — гэта разбураная мараль у грамадзтве. Цішком прададзеныя бомбы, падкупленыя судзьдзі, фальшывая бадзёрасьць паліцэйскіх рапартаў, падпольныя гешэфты спэцслужбаў і баевікоў, дэманстрацыі «людзей-бомбаў» на вуліцах Бэйруту прывучаюць людзей да міззрнасьці жыцьця, да нармальнасьці хаосу. Агенты спэцслужбаў, што кіруюць чорнымі ці чырвонымі брыгадамі, тэрарысты, што прыматкабожыліся на сакрэтных пасадах у спэцслужбах, — чорт іх разьбярэ. Ня будзем забываць і з чаго жывуць тэрарысты: з гандлю наркотыкамі, зброяй, арганізацыі нелегальнай іміграцыі, рэкету, зьбіраньня рэвалюцыйнага ці вызваленчага падатку...



30 траўня ў Паўночнай Ірляндыі абралі форум, які мае знайсьці мірны кампраміс, каб скончыўся, нарэшце, крывавы канфлікт. Сярод іншых былі абраныя, каб змагацца за мір, Джон Уайт, засуджаны на пажыцьцёвае зьняволеньне за забойства сэнатара-каталіка, і Джэры Келі, зацяты бамбіст з Ірляндзкай Рэспубліканскай Арміі... 15 чэрвеня ІРА наладзіла чарговы выбух у Манчэстэры. Вельмі інтэлігентна: за гадзіну да выбуху ў паліцыю патэлефанавалі і папярэдзілі, назваўшы код, што пацьвярджала — гэта ня жарт. У ІРА — маральны ўздым, на выбарах форуму яе палітычнае крыло «Шын фэйн» (Мы самі) атрымала 15% галасоў, найвышэйшы працэнт за апошнія 10 гадоў.

Бульбашы-каталікі складаюць прыкладна трэцюю частку насельніцтва Ольстэра. Ім уласьцівая традыцыйная ірляндзкая ўпартасьць (паводле паданьня, адзін са шматлікіх ірляндзкіх манахаў-сьвятых прастаяў, не заварухнуўшыся, 10 гадоў, так, што птушкі зьвілі гнёзды ў ягоных валасах), за імі падтрымка велізарнае дыяспары (ужо ў VII-X ст. у адну Нямеччыну Ірляндыя экспартавала 145 сьвятых і бажавальных, і нават цяпер, калі плынь эміграцыі зьменшылася, штогод Ірляндыю пакідае каля 1% насельніцтва). Пра тэрарыстаў вядома шмат: іх каля 400, яны добра падрыхтаваныя да гарадзкой вайны, разьбітыя на брыгады па 5-8 чалавек. Усяго на іх узбраеньні 650 аўтаматаў Калашнікава, 20 кулямётаў, 60 рэвальвэраў, 3 т выбуховага рэчыва Semtex і нават адна супрацьпаветраная ракета, якую, праўда, брытанская разьведка лічыць надзейнай. Зброя ляжыць у сховішчах па маленькіх вёсачках за мяжой Ольстэра, у Ірляндзкай Рэспубліцы. Ірлянцы навучыліся рабіць выбухоўку зь нітрабэнзыну, угнаеньняў і дызпаліва. Усе сябры ІРА жалезна падпарадкоўваюцца Ваеннай Радзе, што складаецца з 7 чалавек.

Стагодзьдзямі ўсё ішло паводле пляну. Як напісаў калісьці брытанскі канцлер накконт прыняцьця Крымінальнага закону: «Сыстэма не прадугледжвала існаваньня ірляндзкага каталіка, за выняткам выпадкаў пакараньня». Пратэстанты пацыху вынішчалі цярплівых кельтаў, спачатку ўсьцяж востраваў, у XX ст. — на Поўначы. І раптам нешта перамянілася ў сьвядомасьці людзей, якія ўжо амаль усе забыліся родную гэльскую мову. У 1968 годзе ў Дэры адбыўся першы марш у абарону правоў чалавека. У 1971 годзе быў забіты першы брытанскі жаўнер. Нібыта апошні безвыходны адчай рухаў ірлянцамі. 1972 — брытанскія жаўнеры расстралялі 13 дэманстрантаў у Дэры, 1976 — забіты брытанскі пасол у Дубліне, 1979 — 18 жаўнераў забітыя ўсяго за некалькі месяцаў, 1981 — трагічная, сьмяротная галадаваньне зьняволенага дэпутата Палаты грамадаў Бобі Сэндза пад падступныя воплескі маскоўскага тэлебачаньня, 1984 —ірляндзкая бомба забівае 5 чалавек на зьезьдзе кансэрватыўнай партыі ў Брайтане, 1988 — 3 тэрарысты забітыя падчас спробы заатакаваць брытанскую базу ў Гібральтары... І ўсё гэта — з 14.120 км², нейкай трэцяй часткі Берасьцейскае вобласьці, на якой жывуць 1600 тысячаў чалавек.

Змаганьне вынікла з эканамічнай безвыходнасьці (і цяпер яшчэ ўзровень беспрацоўя сярод каталікоў у 2,5 разы вышэйшы, чым сярод пратэстантаў). Змаганьне вынікла з культурнае пасткі. Кожны народ жыве паводле ўласнай культурнай мадэлі, вызначыць сутнасьць якой вельмі цяжка, бо яна складаецца з мовы альбо яе апошніх парэшткаў — інтанацыяў, са сьвятаў, звычак, не ў апошнюю чаргу харчовых і пітных, з забабонаў, спосабу ўсьміхацца ці пазіраць спадылба, з геаграфічных назваў, якія найчасьцей чуеш, і надвор'я, што бывае, калі сонца заходзіць за хмару, з казак... У старадаўняй ірляндзкай казцы «Жонка самога Аданэла» жанчына абдурыла волата, вынесшы з замка спаміж трох самых каштоўных рэчаў свайго мужа. Паўночнаірляндзкая інтэлігенцыя, песьцячы першыя каліўцы нацыянальнага змаганьня, спадзявалася абхітрыць гісторыю, выратаваць цяжкахворую нацыянальную культурную мадэль. Іншы раз цывілізацыя народу-каланізатара нашмат больш разьвітая альбо багатая, альбо тое, што на мове дурной навукі называецца «прагрэсіўная» за цывілізацыю заваяванага народу. Амэрыканскія індзейцы не будавалі сабораў Сьв. Паўла і ня пілі гарбаты а пятай гадзіне; ханты, мансі і астатнія якуты ня маюць сваіх Талстых і астанкінскіх тэлестудыяў. Ім мусіў бы пайсьці на карысьць доступ да апошніх дасягненьняў, да вялікага інфармацыйнага поля, да адукацыйных цэнтраў, а яны ня проста страцілі мову і культуру, яны сьпіліся, схварэліся, у іх спрацавала цяга да сьмерці, яны сталі часьцей канчаць жыцьцё самагубствам; яны пазьнікалі. Культурная мадэль ствараецца стагодзьдзямі, яе не набудзеш за год; яе не прыдбаеш, як новы парасон замест згубленага. Запаволены тэмп маўленьня, ці то на сваёй мове, ці то на мове каланізатараў — вось найпершая прыкмета ўсеагульнага здранцьвеньня — разам з адсутнасьцю пачуцьця прыгожага, разам з бракам мэханізму перадачы традыцыяў з пакаленьня ў пакаленьне.

Тэрарызм — таблетка ад перадсьмяротнага запою народаў, але, нават дамогшыся незалежнасьці, ці не жахнуцца сваіх грахоў сёньняшнія ольстэрскія ваякі, як жахнуўся, і стагнаў, і плакаў Хулін, герой іншае ірляндзкае казкі, забіўшы Фэрдыяда?

Цяпер справы ў Ольстэры быццам бы пачынаюць выходзіць на добрае, пачаліся перамовы, усьміхаецца Джон Мэйджар. Даўней ірлянцы казалі, што ў жыцьці трэба баяцца трох рэчаў: конскіх капытоў, бычыных рагоў і ўсьмешкі ангельца.

**АНДРЭЙ ДЫНЬКО**

Каляндар

# Шанец... як заўжды

Герой апавяданьня Х.Л.Борхеса «Deutsches Requiem» Ота Дытрых цур Ліндэ, эсэсавец, прысуджаны да расстрэлу, у сваім перадсьмяротным маналёгу сказаў: «Каб усталяваць новы парадак, трэба шмат што зруйнаваць, цяпер мы ведаем, што сярод гэтага шматлікага — наша Нямеччына».

На думку Ота, кожны зь ягоных продкаў-ваяроў на розных войнах загінуў дзеля таго, каб у XX ст. Нямеччына навучыла сьвет жорсткасьці. На маю думку, германцы навучылі сьвет наступу. Нашыя продкі сутыкнуліся з германцамі 790 гадоў таму, калі ўпершыню крыжакі аблажылі памежную фартэцыю Полацкага княства Кукенойс. Гэта здарылася ў той самы 1206 год, калі Вялікі Хурал мангольскіх плямённых саюзаў абраў хана Тэмучына сваім Чынгізханам — Найвялікшым Валадаром. Тады між кітайскім Вялікім Мурам і Амурам нарадзілася сіла, якая выканала адваротную германскай місію. Татара-мангольскае нашэсьце на Кітай, Сярэднюю Азію, Каўказ і Ўсходнюю Эўропу навучыла сьвет абараняцца. Кожны захоплены лапік зямлі германцы пераўтваралі ў СВОЙ. Манголы ж упарта бралі чужыя гарады, каб назаўжды ў іх застацца й асыміляваца. Кітайцы 600 гадоў будавалі на поўначы краіны свой Мур даўжынёй у чатыры тысячы кілямэтраў з мэтай абараніцца ад суседзяў-мэнгу — «барбараў». А тыя пераадолелі перашкоду адно каб стацца кітайцамі.

Пэўна, лёс беларусаў пралягае паміж Наступам і Абаронай: мы не наступаем і не абараняемся — мы ПАРТЫЗАНІМ. Нас быццам няма, але час ад часу мы зьяўляемся, каб ізноў сысьці. Выглядае, што кожнага разу ахвяруючы Айчынай, мы жадаем навучыць сьвет выжываньню.

Неўзабаве двухгодзьдзе першых прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Цяпер, праз два гады, я ўсьцешаны «плодам» тых выбараў. Мы пачалі адвучвацца ад заганнае звычкі — ад партызанства. Мэнгу з Усходу вучыць нас абараняцца. Распушчэньне мангольскіх заваёўнікаў сярод захопленых народаў шэсьць стагодзьдзяў таму цалкам натуральнае. Яны не маглі скарыстаць перамогу, бо ня мелі досьведу абароны. Каб перайсьці ў наступ — трэба сьпярша выстаяць. У 1206 годзе нашыя продкі здалі крыжакам фартэцыю Кукенойс, упершыню на Ўсходзе Эўропы. Можа таму ў 1380 на Куліковым полі князь Ягайла не наважыўся пайсьці ў наступ разам з татарамі. Можа таму мы дагэтуль «партызанім». Цяпер мы ізноў маем магчымасьць парваць зачараванае кола. Альбо —ізноў «партызаніць» да чарговага шанцу. Як заўжды.

**СЕВЯРЫН КВЯТКОЎСКІ**

# Незаўважаны юбілей

14 чэрвеня 1916 году ў Гомелі выйшаў чарговы нумар газэты «Гомельская копѣйка». Як высьветлілася, выйшаў, каб захавацца ў адзіным асобніку, які дайшоў да нашых дзён. Каб трапіць мне ў рукі 14 чэрвеня 1996-га і стаць, можа, адзіным адказам на маё даўняе пытаньне: а ці былі тут горад і гараджане?

Гэтай сьпякотнай парою, калі амаль усе сёньняшнія гараджане вырошчваюць бульбу на бацькоўскіх палетках, сумневы мацнеюць. Маўляў, засялі сюды, у другі паводле насельніцтва беларускі горад, яшчэ паўмільёна, — яны заўтра ж выправяцца да свайго ўлюбёнага хобі, пра сваё гарадзкое існаваньне нагадваючы толькі перагарам ды перабрэхам рэдкімі пахмурнымі дзянькамі.

Я набыў сабе піва ды прысеў у сквэры каля пляца Перамогі, каб пагуляць з самім сабою ў гульню — уявіць, што нумар «Копѣйки» сьвежы, і вырашыць адвечнае пытаньне гультая: «Куды падзець сябе?»

Я разгубіўся, не пазнаўшы свой горад, які паўстаў раптам такі незнаёмы і такі жывы. Зь цяжкасьцю здагадваючыся, дзе ж усё гэта магло разьмяшчацца, я пагрузіўся у чытаньне стракатай гарадзкой афішы.

У Максімаўскім парку ў кінатэатры даюць «захватывающую жизненную драму «На костре страсти», а «сверх программы: гастролі фантастическаго балета Елены Чекетти и повсемѣстн. любимца русско-еврейск. юмориста г. Подлубнаго». А можа, накіравацца ў тэатар на сквэры, дзе «малороссы» граюць апэрэтку «Страшна росплата»? А можа, адразу — у рэстарацыю «Савой», дзе грае італьянскі струнны канцэртны аркестар пад кіраўніцтвам Леоні Паліні пры ўдзеле інтэрнацыянальных сьпявачак і дуэтыстак M-lle Алдроўндзі й M-lle Дружынінай, і дзе маецца більярд, а сьвежая правізія атрымліваецца са сталічных гарадоў? А яшчэ ёсьць тэатар «Рэнэсанс» з трупай ліліпутаў «БІ-БА-БО», а яшчэ тэатар-кабарэ «МУЛЕН-РУЖ», а яшчэ Інтымны тэатар. І куды ні пойдзеш — усё «грандиозно», і каго ні пабачыш — усе «повсеместно известны». Заштатны, павятовы гарадок жыве «на всю катушку». І быццам няма вайны, пераможныя весткі зь якой запоўнілі другую паласу газэты. Яны настолькі пазнавальныя, што гульня губляе забаўляльнасьць. Каўкаскі фронт аднолены, і ўжо патыхае Заходнім. «Вчера утромъ сѣвернѣе Барановичей летчики подпоручикъ Квасковъ и унтеръ офицеръ погибли смертью героевъ». Чамусьці не знайшлося месца для імя героя ніжэйшага рангам...

На трэцяй паласе — зусім «цёпла». Барацьба за «трезвость», разгляд гарадзкой управай пытаньня аб увядзеньні карткавай сыстэмы «на предметы питанія», скаргі на бруднае паветра жыхароў Кагальнага рову і рабаўніцтва на суму 400 рублёў з кватэры нейкага Гейлікмана. На паўпаласы — надта праблемны артыкул заклапочанага рэдактара-выдаўца Міляева аб недастатковым «насажденіи культуры» ў павеце. «А вѣдь кому-кому, а деревнѣ, особенно бѣлорусской, необходимо прійти на помощь въ этомъ отношеніи»...

Гульня раптам згубіла сэнс. Стала нецікаваю. Не таму, што мне ня хочацца ў несапраўдны «МУЛЕН-РУЖ». Вельмі хочацца. Але ж я ведаю, што будзе ў наступных нумарах. І ня важна, заўважаць ці не гомельцы 7-га студзеня 1919 году ў газэце «ПОЛѢСЬЕ» сярод «баляў-маскарадаў» і «электрических ёлок» невялічкую абвестачку пра тое, што ўлада ў горадзе пераходзіць да Рэўкому. Пасьля чаго падпісчыкі ўжо ніколі не дачакаюцца сьвежай «капеечкі». А Гомелю надоўга расхочацца быць падобным да Парыжа...

«Гомельскую копѣйку» адрадзіць ня ўдасца. У адрозьненьне ад «Нашай Нівы». Новы горад так і «не обкультурил» новых сваіх насельнікаў. І не пакінуў ім нават намёку на тое месца, дзе некалі быў Максімаўскі парк і «Савой». Але ж яно, месца, занадта шыкоўнае, каб быць надоўга пакінутым у сёньняшнім мёртвым спакоі.

**ЗЬМІЦЕР БАРТОСІК**

№ 16/96
1 — 7 ліпеня

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

# ІНФАРМАТАР
НАША НІВА

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION






## БІРЖА ПРАЦЫ

Merlintour French travel agency in Minsk is looking for a **SENIOR AGENT**. You should be fluent in English (french as a second language is welcome), graduate of a high commercial school and at least 25 years old. Autonomy, initiative, imagination, capacity to work productively with computers are required. Address your cv to 220012, Менск, Талбухіна, 6.

Менскай тэкстыльнай Асацыяцыі на конкурснай аснове патрабуецца **мадэльер-канструктар** лёгкага адзеньня з досьведам працы. Тэлефон для даведак (0172) 50-43-14. Тэл. (0172) 10-21-52 (код абавязковы).

Рамонтна-будаўнічай фірме патрабуецца **арганізатар** з досьведам працы. Тэл. 238-51-70. Алег.

Установе патрабуецца **кіроўца катэгорыі B, C, E**. Тэл. 258-90-55 (з 9.00 да 11.00).

Запрашаем на працу **дырэктара мясакамбіната.** Праца ў Івянцы (60 км ад Менску). Тэл. (017) 224-95-92, 224-43-96.

Праца ў будаўнічай фірме Конкурсны адбор на вакантныя пасады: 1. **Начальнік будаўнічай управы** — аб'екты ў РБ і замежжы. Адукацыя: вышэйшая будаўнічая. 2. **Намесьнік начальніка** плянава-вытворчага аддзелу вытворча-тэхнічнай камплектацыі — аб'екты ў РБ і замежжы. Адукацыя: вышэйшая будаўнічая. 3. **Начальнік аддзелу працы** й заробнае платы — нармаваньне працы на аб'ектах. Адукацыя: вышэйшая будаўнічая, сярэдне-тэхнічная. 4. **Інжынэр ВТА** — інжынэрная падрыхтоўка будаўніцтва, складаньне каштарысаў. Адукацыя: вышэйшая будаўнічая. 5. **Прараб** — генпадрадная праца; сантэхнічная праца, электратэхнічная праца. Адукацыя: вышэйшая будаўнічая, сярэдне-тэхнічная. 6. **Тэхнічны экспэрт будаўнічых тэхналёгіяў** — майстры вытворчага навучаньня, рабочыя будаўнічых спэцыяльнасьцяў вышэйшых катэгорыяў, з досьведам працы за мяжой. Адукацыя: сярэдне-спэцыяльная. 7. Рабочыя будаўнічых спэцыяльнасьцяў — **аздобнікі, маляры, сталяры-цесьляры, муляры, мантажнікі**. Адукацыя: сярэдне-спэцыяльная. Агульныя патрабаваньні: досьвед працы ў адпаведнай галіне ня меншы за 5 гадоў, веданьне нарматыўнай дакумэнтацыі, высокі інтэлект, культура, камунікабэльнасьць, узрост ад 25 да 40 гадоў. Даведкі праз тэлефон: (017) 275-20-24 з 13.00 да 15.00 (да 10.07.1996).

Запрашаем энэргічных людзей на пасаду **гандлёвага агента**. Тэл. 262-49-00. Тэл. 262-52-50.

Запрашаем на высокааплатную сталую працу, ад $ 250, зьвязаную з выправамі (камандзіроўкамі). Абавязковая мэдычная ці фармацэўтычная адукацыя. Пажадана веданьне моваў Прыбалтыкі. Тэл. 98-81-58, 98-86-88.

Запрашаем **рабочых** будаўнічых спэцыяльнасьцяў. Тэл. 265-06-02.

Патрабуецца **прадавец** на аўтарынак. Тэл. 257-77-75.

Патрабуецца **вартаўнік** на стаянку. Узрост 40-50 гадоў. Раён Серабранкі. Тэл. 246-50-40.

Патрабуецца прафэсійны: **маляр-падрыхтоўнік; кодабнік; аўтасьлесар** і мужчына ва ўзросьце ад 45 да 55 на пасаду **мэханіка СТА**. Тэл. 251-91-34.

Працаўладкоўваем: **бугальтараў, мэнэджэраў, сакратароў-рэфэрэнтаў, перакладчыкаў, нянек, хатніх гаспадыняў, кухараў**. Тэл. 60-44-54, з 9 да 21 гадзіны.

Фірме тэрмінова патрабуюцца на працу **маляры-тынкоўнікі**. Тэл. 221-85-70.

У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 — 15):
**Кошты на менскіх рынках:** Камароўка (ІНФАРМАТАР №1, 7, 10); Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФАРМАТАР №2, 8); Аўтарынак (ІНФАРМАТАР №3, 12); Кошты на кампакт-дыскі (ІНФАРМАТАР №4); Кошты на кватэры ў Менску (ІНФАРМАТАР №5); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФАРМАТАР №6); Кошты на кампутары. Менск (ІНФАРМАТАР №9).
**Транспарт:** Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФАРМАТАР №1,15); Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФАРМАТАР №2, 12); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФАРМАТАР №3); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФАРМАТАР №5).
**Адукацыя:** Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФАРМАТАР №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФАРМАТАР №2); Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФАРМАТАР №3-4); ВНУ. Акадэміі (ІНФАРМАТАР №8-10).
**Біржа працы:** Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФАРМАТАР №1- 9); Новыя вакансіі й працоўныя месцы па Беларусі (ІНФАРМАТАР №1-15).
**Адпачынак:** Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФАРМАТАР № 1-15); Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФАРМАТАР №1- 15).
**Спажывец:** Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў блізкага і далёкага замежжа (ІНФАРМАТАР №2); Твае правы, пасажыр (ІНФАРМАТАР №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркаваньне (ІНФАРМАТАР №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФАРМАТАР №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФАРМАТАР №5); Пра новыя даляры. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код — як яго расшыфраваць (ІНФАРМАТАР №6); Як выбіраць обутак (ІНФАРМАТАР №7); Міжнародная сыстэма гатэляў (ІНФАРМАТАР №10); Каб вырасла рэпа вялікая...(ІНФАРМАТАР №11); Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне. Вучымся эканомна кіраваць аўтамабілем (ІНФАРМАТАР № 12).
**Здароўе:** Перш чым зьвяртоцца да лекара. Як кінуць паліць. (ІНФАРМАТАР №4), Прыродныя атруты (ІНФАРМАТАР №10).
**Гаспадарка:** Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы. (ІНФАРМАТАР №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФАРМАТАР №6); Як мыць і чысьціць посуд. Калі заліла кватэру... (ІНФАРМАТАР №8); Як пабудаваць садовы дамок. Дом і дзялянка (ІНФАРМАТАР №9).
**Грамафон:** Старонка вершаванага радка (ІНФАРМАТАР №6, 8, 11).
**Харчаваньне:** Якую гарбату мы п'ем. Пра часнык (ІНФАРМАТАР №7); Бары, рэстарацыі, кавярні Менску (ІНФАРМАТАР №15).
**Спорт:** Вынікі спаборніцтваў і інш. (ІНФАРМАТАР №7, 9).
**Біблітэка**: Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФАРМАТАР №9, 10, 11, 15).
ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:
**Рынак:** Новыя кошты на розныя тавары.
**Адукацыя:** Адукацыя ў Беларусі (працяг).
**Спажывец:** Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне.
**Спорт:** Вынікі спаборніцтваў і інш.
**Гаспадарка:** Карысныя гаспадарчыя парады.
**Грамафон:** Новыя творы нашых чытачоў.



3 гэтага нумару "ІНФАРМАТАР" пачынае знаёміць свайго чытача з правіламі гульні ў більярд. Ст. 12

# КАЗЫНО, ДЫСКАТЭКІ, КЛЮБЫ, НАЧНЫЯ ШОЎ

## Казыно



**Адмірал** вул. Мясьнікова, 25 (202-409, 207-804). 18.00–6.00; час працы гульнёвых аўтаматаў з 16.00 да 7.00: рулетка, Black Jack, покер, гульнёвыя аўтаматы; магнітафон; ёсьць 2 бары (валютны й рублёвы), клюб, кошты ніжэйшыя за сярэднія ў казыно гораду ўвогуле.

**Адмірал** пр. Пушкіна, 39 (572-204). 18.00–6.00; рулетка, Black Jack, покер, гульнёвыя аўтаматы; магнітафон; ёсьць бар (3 паверх) і рэстарацыя (3 паверх, да 23.00).

**Плянэта** пр. Машэрава, 23 (238-587). 16.00–5.00: музычная квадрасыстэма; рулетка, Black Jack, покер; більярд. Рэстарацыя: ансамбаль, вар'етэ, вечаровыя гарнітуры; вячэра $10 паводле курсу; эўрапейская й грузінская кухні; дзеці не дапускаюцца; паляць; праз тэл.; 60 месцаў, ахова.

**Эмір** вул. Старажоўская, 15 (344-074). 17.00–7.00; рулетка, Black Jack, покер; магнітафон; ёсьць бар, сярэдні кошт лёгкай вячэры (са сьпіртным) $13, кошт сьпіртнога ад $10 да $100. Кошт уваходнай і гульнёвае фішкі $10.

**Юбілейнае** пр. Машэрава, 19 (гатэль Юбілейны) (269-904). 13.00–2.00: рулетка, Black Jack, покер, трэйд-покер; магнітафон; ёсьць бар, сярэдні кошт лёгкай вячэры са сьпіртным каля $20.

**777** пр. Машэрава, 4 (Палац спорту) (238-458). 18.00–5.30; магнітафон; рулетка, Black Jack, покер, гульнёвыя аўтаматы; ёсьць кавярня.

## Дыскатэкі

**Бег часу** пр. Партызанскі, 117а (ДК МАЗ, 430-154). 19.30–22.30. Пятніца – вечары моладзі; субота – вечары адпачынку "Каму за 30"; нядзеля – вечары адпачынку "Каму за 40"; вечаровыя гарнітуры; ня паляць; 200-400 чалавек; бар, халодныя закускі, сухое віно, сокі.

**Зыгзаг** вул. Матусевіча, 20 (ДК тонкасуконнага камбінату; 558-294, 554-182). Субота, нядзеля, сьвяточныя дні; 21.30–0.30 (вар'етэ); 21.30–23.30 музыка; будзённыя гарнітуры; ня паляць; 600 месцаў; кава, напоі, піва, сасіскі, халодныя закускі, дэсэрт; ахова.

**Малінаўскі кактэйль** вул. Спартыўная, 12 (ГДА Уручча, 668-002). Пятніца 18.00–30.00, школьная дыскатэка; субота, нядзеля 20.00–24.00; будзённыя гарнітуры; ня паляць; 300 месцаў; бар, шакаляд, халодныя закускі, цыгарэты; ахова.

## Клюбы

**Міраж** вул. Я.Коласа, 73 (624-013). 12.00–17.00, 18.00–24.00, без выходных; магнітафон; TV, відэа; 1-я субота месяца Саўнд-Джаз-Клюб; вечаровыя гарнітуры; сярэдні кошт абеду 80.000; эўрапейская кухня; паляць; перадаплата; 45 месцаў; ахова; бар; карціны на продаж.



**Расейскі більярд** вул. Багдановіча, 143 (202-826). Рэстаран, бар, більярд; 18.00–6.00; музычны цэнтар; вечаровыя гарнітуры; эўрапейская кухня; прысутнасьць дзяцей не абмяжоўваецца; паляць; перадаплата; 20 месцаў; ахова.

## Начныя шоў

**Акварыюм** вул. Кульман, 14 (324-875, 312-053). 20.00–5.00; штодзённая дыскатэка; чацьвер, пятніца, субота шоў-праграма; дзеці не дапускаюцца; эўрапейская кухня; апроч працоўнай, спартовай вопраткі; 150 месцаў; ахова; панядзелак выходны; удзень кавярня 12.00–19.00.

**Заслаўе** мястэчка Ждановічы, Менскае мора, аўт. 227 (998-256, 998-258). 20.00–7.00; шоў-балет; вечаровыя гарнітуры; дзеці не дапускаюцца; эўрапейская кухня, магчымая індывідуальная замова; паляць; перадаплата; да 120 месцаў. Бар 12.00–23.00 штодзённа; дыскамузыка; 75 месцаў. Камінная заля да 20 месцаў, вялікая заля на 100 месцаў; ахова.

**Ксантыя** вул. Чырвонаармейская, 3 (260-602). 20.00–6.00; музычны цэнтар; мужчыны $10 паводле курсу, жанчыны да 24.00 бясплатна; вечаровыя гарнітуры; $30 паводле курсу; эўрапейская кухня; дзеці не дапускаюцца; паляць; замова праз тэл.; перадаплата; 80 месцаў; ахова.

**Макс-шоў** пр. Скарыны, 73 (кінатэатар "Кастрычнік") (320-038). 21.30–2.00: шоў-балет, вар'етэ панядзелак, аўторак; ад $2 да $10; вечаровыя гарнітуры; эўрапейская кухня, фірмовыя стравы; дзеці не дапускаюцца; паляць; перадаплата; бар; ахова.

Начная шоў-дыскатэка **Парадыз** пр. Машэрава, 13 (кінатэатар "Масква") (235-533). Пятніца, субота 23.00–6.00 шоў-праграма; $12-15 паводле курсу; нядзеля, чацьвер 23.00–4.00 дыскатэка, $8 паводле курсу, для дзяўчат $3; да 18 гадоў не дапускаюцца; кухня Стэкхаўз; 200 месцаў; вечаровыя гарнітуры; ахова.

**Церамок** вул. Пляханава, 38 (481-151). 20.00–4.00; TV, відэа, сьветламузыка, ансамбаль; $1 паводле курсу; вечаровыя гарнітуры; $5 паводле курсу; эўрапейская і беларуская кухні; дзеці не дапускаюцца; паляць; перадаплата ці замова праз тэл.; 50 месцаў; бар.

# ТЭАТРЫ, КАНЦЭРТЫ

Ліпень

### БАЛЕТ

*тэл. 34-06-66 (каса), 34-11-42, 34-80-74*

**Лебядзінае возера**
5 ліпеня, пятніца П.Чайкоўскі. Балет у 4-х дзеях.

**Тры парася**
7 ліпеня, нядзеля, раніца С.Кібірава. Балет у 2-х дзеях.

**Карміна Бурана**
7 ліпеня, нядзеля, вечар К.Орф. Вакальна-харэаграфічнае шоў у 1-й дзеі.

**Кармэн-сюіта**
Ж.Бізэ – Р.Шчадрын. Балет у 1-й дзеі.

### ТЭАТАР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

**Паўлінка**
6 ліпеня, субота Я.Купала. Камэдыя ў 2-х дзеях.

**Тапалевая завея**
7 ліпеня, нядзеля М.Задорнаў. Камэдыя ў 2-х частках.

### ТЭАТАР МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ

*тэл. 20-81-26, 20-92-54*

**Сільва**
2 ліпеня, аўторак І.Кальман. Апэрэта ў 3-х дзеях.

**Жанчына-кажан**
3 ліпеня, серада Ё.Штраўс. Апэрэта ў 3-х дзеях.

**Шапэніяна**
4 ліпеня, чацьвер Ф.Шапэн. Балет у 1-й дзеі.

**Шахеразада**
Н.Рымскі-Корсакаў. Балет у 1-й дзеі.

### ТЭАТАР-СТУДЫЯ КІНААКТОРА

**Фантазіі паводле Гогаля**
2 ліпеня, аўторак

**Мы ідзем глядзець "Чапаева"**
3 ліпеня, серада А.Данілаў.

**Айсэдора**
4 ліпеня, чацьвер, 5 ліпеня, пятніца. Танец каханьня.

**Выкраданьне Алены**
6 ліпеня, субота, 7 ліпеня, нядзеля Л.Вэрнэйль.

### ДОМ АФІЦЭРАЎ

Гастролі Цэнтральнага Акадэмічнага тэатру Расейскай Арміі.

**Каляровыя сны пра чорна-белае**
1 ліпеня, панядзелак, 3 ліпеня, серада А.Данілаў. Камэдыя ў 2-х дзеях.

**Шарады Брадвэю**
2 ліпеня, аўторак, 4 ліпеня, чацьвер М.Ор, Р.Дэнэм. Шоў-камэдыя ў 2-х дзеях.

**КОШТЫ НА РЭКЛЯМУ Ў ГАЗЭЦЕ "НАША НІВА" І ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ДАДАТКУ "ІНФАРМАТАР"**

| | "НАША НІВА" | "ІНФАРМАТАР" |
|---|---|---|
| Базавая стаўка ч/б | $0,5 см² | $0,4 см² |
| Замова ў рэклямным бюро | $0,5 см² | $0,4 см² |
| Замова праз тэлефон | $0,6 см² | $0,5 см² |
| Першая паласа | ч/б — $1 см² Колер (ня меней за 100 см²) — $2,5 см² | ч/б — $0,9 см² |
| Радковая рэкляма на паласе "Біржа працы" | | 5.000 руб. (зьмяшчаецца запар у двух нумарах) |
| Колер | ня меней за 50 см² — $1 | ня меней за 20 см² — $1,5 см² |
| TV—праграма | | ч/б — $1 см² колер — $1,5 см² (ня меней за 50 см²) |

Замовіць рэкляму можна праз тэлефон 36-76-75 з 10.00 да 20.00 штодня, ці на адрасе: вул. Пуліхава, 29, кв. 61, да 18.00. Пры гэтых коштах ня ўлічваецца выраб арыгінал-макету.

*** Прадугледжаны скідкі на колькасьць выхадаў і плошчу рэклямных абвестак**

Падпіска на газэту
**"НАША НІВА"**
праз пошту і "САЮЗДРУК"
**індэкс 63125.**
**Падпісны кошт** 13.000 на месяц
39.000 на квартал
**Падпіска праз недзяржаўную сетку дастаўкі**
тэлефон 29-22-10 (Цыбульскі Леанід)

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Вольскі А. Карусэль: Вершы: Для малодшага школьнага ўзросту.** / Мастак А.Карповіч. – Менск: "Асар", 1996. – 176 с.: іл. 25.000 ас. ISBN 985-6070-17-1.

**Шейкин Г. Полоцкая епархия** / Религиозное издание. – Менск: "Белорусское православное Братство Трёх Виленских Мучеников", 1996. – 96 с.: іл. 2000 ас. ISBN 985-6143-04-7.

**Конституция Республики Беларусь: Научно-правовой комментарий.** / Под общей редакцией В.Тихини и др. – Менск: Беларусь, 1996. – 223 с. 3000 ас. ISBN 985-01-0112-1.

# Набліжаюцца ўгодкі

### Славяноведение. 1996, №2

Набліжаюцца чатырохсотыя ўгодкі Берасьцейскай царкоўнай уніі. Маскоўскі часопіс "Славяноведение" прысьвяціў гадавіне адмысловы нумар. Слова было дадзена найбольш абазнаным у гісторыі гэтай падзеі навукоўцам. Беларускія і ўкраінскія дасьледнікі не былі запрошаны да размовы. Празь іх галовы маскоўскія навукоўцы вядуць дыялёг з калегамі з "другога" боку – Польшчы і Нямеччыны. Не атрымалі запрашэньня ўласна царкоўныя гісторыкі, хаця цэрквы – праваслаўная, уніяцкая, каталіцкая – набіраюць усё большую вагу ва ўсходнеэўрапейскіх краінах. Можа, таму размова на старонках часопіса атрымалася незаангажаваная, узважаная, па-сапраўднаму навуковая.

Артыкулы М.Дзьмітрыева і Б. Флоры, як падаецца, ёсьць вытрымкамі зь іх супольнае кнігі, якая выходзіць з друку ў Маскве. Пакуль навуковай грамадзкасьці прапанаваны галоўныя высновы аўтараў. Увогуле пра унію напісана так шмат, што кожны пункт погляду ўжо ня можа лічыцца новым. Новае ў гэтым выпадку тое, што прапанаванае трактаваньне падзеяў можна разглядаць як першае посткамуністычнае афіцыйна-навуковую.

Ініцыятарамі ўнійных перамоваў, адзначаюць М.Дзьмітрыеў і Б.Флора, былі самі праваслаўныя, дакладней, – вярхі праваслаўных алтарнікаў. Мяркуем, што такі погляд маскоўскіх навукоўцаў будзе не даспадобы прыхільнікам Маскоўскага патрыярхату. Прычыны пераходу праваслаўнага епіскапату Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай на пазыцыі уніі аўтары будучай кнігі бачаць у наступленьні рэфармацыі розных плыняў на аснове артадаксальнага праваслаўя. Пры разгляданьні гэтай праблемы было б варта ўзяць на ўзбраеньне некаторыя катэгорыі польскай гістарычнай навукі, якая шмат і плённа дасьледавала рэфармацыю ў асяродзьдзі каталіцызму.

Вылучаюць, па-першае, рэфармацыю па-за касьцёлам, па-другое, рэфармацыю ўсярэдзіне касьцёла. У дачыненьні да праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай першую ўвасабляюць розныя плыні "ерэтыкоў", другую – нішто іншае, як праваслаўныя брацтвы. Якой жа рэфармацыі спалохаліся нашы біскупы, што паехалі па дапамогу ў Рым? Думаецца, ня столькі першай рэфармацыі, зь якой пачалі пасьпяхова змагацца езуіты і рэфармаваны (але не рэфармацыйны!) касьцёл у цэлым, колькі другой. Усе гэтыя праваслаўныя брацтвы ў вачах біскупаў і больш дробных алтарнікаў-праваслаўных выглядалі сапраўднымі здраднікамі, бо пераходзілі пад непасрэдную юрысдыкцыю канстантынопальскага патрыярха і ўводзілі сваё самакіраваньне. Менавіта няздольнасьць унутранага рэфармаваньня прывяла праваслаўных біскупаў у Рым, а вось прычыны такой няздольнасьці засталіся па-за старонкамі "Славяноведения". Што ж, пачакаем выхаду кнігі і выкажам уласнае меркаваньне пра гэта.

У прынцыпе, кансэрватызм царквы (тая ж адмова ад рэфармаваньня) – гэта вялікая сіла праваслаўя, сіла маральная. Але ў рэальным жыцьці кансэрватызм няздольны на самаіснасьць. Маральная сіла праваслаўя заўсёды патрабуе падпоркі з боку дзяржаўнае сілы. Першую палову XVI ст. шмат якія гісторыкі называлі найбольш спрыяльным часам для праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Спрыяльнасьць палягала ў тым, што вялікія князі пакінулі царкву сам-насам, без прыціску (было "небрежное покровительство", як сказаў адзін расейскі гісторык). Вынік – маральны разлад царквы, заняпад арганізацыйны, адукацыйны і сьветаўспрымальны. Наступны вынік – паездка праваслаўных біскупаў на паклон да Папы рымскага.

Б.Флора ў сваім артыкуле разгледзеў наступствы уніі ў Рэчы Паспалітай для праваслаўнага жыхарства. Незадаволеныя, зразумела, былі, і сваю нязгоду з уніяй яны выказвалі вельмі востра. Б.Флора дасьледаваў матэрыялы допытаў перабежчыкаў, якія перасяляліся ў Масковію. Люд гэты быў просты, і ўспрыманьне уніі ў яго таксама было простае: калі на чале аб'яднанай царквы стаў рымскі Папа, значыць, людзей проста перацягнулі ў каталіцтва, у ляскую веру. Такім чынам, усе складаныя пытаньні веры, тэалёгіі зводзіліся да пытаньняў палітычнай улады.

Казакі, якія не прынялі уніі, пачалі разглядацца як самастойныя палітычныя сілы, апірышча рускай веры. Адсюль ужо недалёка было да вызначэньня рускай (украінскай) нацыі – казацкай, праваслаўнай. Увогуле, прыняцьце уніі прынесла новыя моманты ў этнагенэтычныя працэсы Ўсходняй Эўропы і значна паскорыла іх. Калі раней "рускі народ" быў па-сутнасьці ўкраінска-беларускім супольніцтвам, то з пачаткам XVII ст. яго разуменьне звужаецца да казацтва, гетманскай Украіны. Беларусь засталася ў баку ад казацтва, і такая палітычная адасобленасьць прывяла да адасобленасьці этнічнай. Гэта адразу адбілася і на найгалоўным этнічным паказьніку – веры. Зусім невыпадкова ў пачатку XVII ст. у асяродку простага люду нашай краіны зьявілася вызначэньне "беларускае веры" – старадаўняя, праваслаўная, не падначаленая ні Рыму, ні ляхам, ні Маскве. Увядзеньне ў навуковы зварот гэтых матэрыялаў – важкі ўклад Б.Флоры ў распрацоўку ўнійнае тэмы.

Магчымасьць выказацца пра унію "Славяноведение" дало і польскаму боку ў асобе Аліны Навіцкай-Яжовай. Яе артыкул прысьвечаны "культурна-асьветніцкай" дзейнасьці базыльянаў у Рэчы Паспалітай. Словы ў двукосьсі ўзяты з загалоўка і адлюстроўваюць галоўную думку артыкула. Унія, такім чынам, падаецца са станоўчага боку.

"Славяноведение" дало слова і навукоўцам, якія прадэманстравалі прыклады суіснаваньня праваслаўя і каталіцтва па-за межамі уніі. Людольф Мюлер зь Нямеччыны разгледзеў хістаньні паміж дзьвюма канфэсіямі вядомага расейскага філёзафа У.Салаўёва, яго спробу неяк спалучыць іх, прынамсі злучыць іх мастамі, ажыцьцявіць нейкую ўнутраную унію ў сваёй душы.

Артыкул Леаніда Люкса з Польшчы распавядае пра формы супраціву польскай каталіцкай царквы націску з боку камуністычных уладаў у 1945-1989 г. Гэта хутчэй ужо не пра унію, а пра бескампрамісную (хоць калі-нікалі якраз кампрамісную) барацьбу.

Маскоўскія беларусісты Ю.Лабынцаў і Л.Шчавінская дасьледуюць "народную літаратуру праваслаўнае Польшчы" 1918-1939 г. Гутарка ідзе пра танныя рэлігійныя выданьні. Раней навука імі зусім не займалася. Цяпер у вачах Масквы яны набылі няхай не навуковую, але сымбалічную каштоўнасьць як праява нязломнасьці праваслаўнае веры. Пераважна гэтыя выданьні надрукаваныя па-расейску, крыху выйшла па-ўкраінску, нічога – па-беларуску. Можа, таму і зьявіліся ў цяперашняй Польшчы "праваслаўныя палякі" і ўсё менш "праваслаўных беларусаў", што праваслаўе дрэнна стасуецца зь беларускаю мовай. Дзе ж тая унія...

*Валеры Пазьнякоў*

## Кніга – поштай



1. **Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме...** Зборнік інтымнае прозы. — Менск: Сучасная літаратура, 1995. — 310 с. 49.000 БРБ
2. **Адам Глёбус. Скрыжаваньне.** — Менск: БАДППР — «Ковчег», 1993. — 46 с. 7.000 БРБ
3. **Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** — Вільня, 1994. — 192 с. 29.000 БРБ
4. **Баляслаў Лесьмян. Пан Бліщынскі** / Пераклад з польскай. — Вільня-Менск: «Наша Ніва» — «Мастацкая Літаратура», 1994. — 93 с. 17.000 БРБ
5. **Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** — Менск, 1993. — 352 с. 29.000 БРБ
6. **Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі.** — Менск: БФС — «Тэхналёгія», 1995. — 336 с. 24.000 БРБ
7. **Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія.** — Менск: БФС — «Тэхналёгія», 1996. — 486 с. 35.000 БРБ
8. **Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.** — Менск: БФС — «Тэхналёгія», 1995. — 328 с. 24.000 БРБ
9. **Энтані Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** — Менск: БФС — «Эўрафорум», 1995. — 272 с. 20.000 БРБ
10. **Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку.** — Менск: БФС — «Кліч», 1995. — 312 с. 20.000 БРБ
11. **Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.** — Менск: БФС, 1996. — 272 с. 24.000 БРБ
12. **Беларускі рок-н-рол: Тэксты** («Бонда», «Крама», «Мроя», «Новае Неба», «Уліс»). — Менск: «Ковчег», 1994. — 64 с. 7.000 БРБ

Каб атрымаць патрэбную Вам кнігу, трэба пералічыць пазначаную суму грошай на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. Не забудзьцеся падаць свой адрас.

## Кніга – поштай



**Рэдакцыя часопіса «Калосьсе» прапануе наступныя выданьні:**

1. **Калосьсе, №1-1993.** — 60 с. 10.000 БРБ
2. **Калосьсе №2-3-1995.** — 144 с. 25.000 БРБ
3. **Вінцэсь Мудроў. Жанчыны ля басэйна.** — Менск: Мастацкая літаратура, 1992. — 160 с. 15.000 БРБ
4. **Юры Гумянюк. Твар Тутанхамона.** — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 52 с. 10.000 БРБ
5. **Алесь Аркуш. Разьтаньне з Танталам.** — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 54 с. 10.000 БРБ
6. **Ігар Сідарук. Саната Арганата.** — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 64 с. 10.000 БРБ
7. **Лявон Вольскі. Калідор.** — Полацак: Полацкае ляда, 1993. — 38 с. 10.000 БРБ

Каб отрымаць патрэбную Вам кнігу, пералічыце названую суму грошай на адрас: Алесь Козік, 211440 Наваполацак-11, п/с 36. Не забудзьце падаць свой адрас.




**НАВІНКА!**

**Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.** *— Менск: Беларускі Фонд Сораса (Сэрыя «Адкрытае грамадзтва»), 1996.*

Спэцыяліст, калі ён прафэсійна дасьведчаны ў сваёй дысцыпліне, можа распавядаць пра яе глыбока й нязмушана. Так напісана кніга «Ўводзіны ў археалёгію». Тут усё галоўнае пра гэтую навуку – ад нараджэньня археалёгіі да археалёгіі ў будучыні. У Менску кніга прадаецца ў кнігарнях "Сьветач", "Акадэмкніга", у шапіку на гістфаку БДУ

# Новы беларускі кніжны праект у Гомелі

**Беларускі Гуманітарны Фонд «Наша Ніва»**

**ў памяшканьні Гомельскай абласной унівэрсальнай бібліятэкі**

**(пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў**

**(тэл. 55-71-97) адкрыў кніжны аддзел.**

**Гэта адзіная кропка ў 500-тысячным горадзе, дзе можна пабачыць такі асартымэнт сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, найноўшыя пераклады.**

**Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.**

**Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культурнае сытуацыі.**

## КАСЭТЫ — поштай



1. **НОВАЕ НЕБА. Сон у трамваі:** Сон у трамваі; Выбар; А ты забудзь маё імя; Жахлівая прыгажосьць; Дом; Калыханка; Таму што; Той, хто стаіць у мяне за плячыма.
2. **НОВАЕ НЕБА. Go home (1995):** Прэзыдэнт, ідзі дамоў; Дакраніся да вады; Падае сьнег; Крот-2; Электарат; Цемра; Выгнаны сын; Канцэрт у Westclub 7 сакавіка 1995 г. (жывы гук).
3. **НОВАЕ НЕБА. Дзеці чорнага гораду (1991):** Чарга па хлеб; Сірата; Вочы ваўчыныя; Замова; Не, гэта ня сьмерць; Дзеці чорнага гораду; Вакно; Ёсьць; Караблік; Ты прыходзіш; Шостае падарожжа; Звон.
4. **КРАМА. Камэндант (1995):** Камэндант; Малдаванка; Навошта я цябе кахаю; Мама; Паходная; Стой тут; We are going down; Польскі бізнэс; Там, дзе нас ня будзе.
5. **КРАМА. Хворы на Rock-n-Roll:** Бяжы, хлопец; Здраднік; Хворы на рок-н-рол; Выпі са мной да дна; Чыкага найтс; Каханьне а шостай гадзіне; Стэфаніда; Мне мой сябра сказаў; Новая кроў; Будзь разам з намі.
6. **КРАМА. Гэй, там, налівай! (1994):** Канада; Ім ня трэба мой блюз; Сабака; Гэй, там, налівай; Што ты шукаў; Чакай; Карчма; Доўгія ногі; Яе хлопец; Я вярнуся сюды; Слуцкая брама.
7. **N.R.M. LaLaLaLa (1995):** Белыя лебедзі; Ноцыя; Дарога; Мітусьня; Не хадзіце ў цёмны лес (Зомбі); Бацька; Трактар; Дзе тое слова; Дойце; Бывай; Лалалала; Халі-галі.
8. **ULIS. Life (1996):** Як плынь ракі; У вагні; Паходная; Па-над дахамі; Залаты ланцуг; Аднойчы; Пачвара; Усё было недарэчы; Альбо бывай; Па калідоры; Астатні цягнік; Усё альбо нічога; Цмок, каралева.
9. **УЛІС. Чужаніца (1991):** Краіна ў кратах; Пляц Францыска; Гестапа; Іржавыя дні; Акторка; Чужаніца; Калі імпэрыя зьнікне; Пакуль сьпяваю.
10. **УЛІС. Краіна доўгай белай хмары (1990):** Другое падарожжа; Памажы; Першае дрэва; Кругі на вадзе; Радыё свабода; Краіна доўгай белай хмары; Ерусалім; Добры напой; Брама жыцьця.
11. **БОНДА. Найлепшыя песьні**: Не сьпяшайся; Ліст дадому; Слуцкая брама; Кожны з нас; Падарожжа; Блюз; Вынаходнікі; Стэфка; Соль жыцьця; Раз-пораз...
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС. Наша ўскраіна (1991):** Вецер; Шлях дамоў; Далёкі сьвет; Ноч; Ускраіна; Я жыў; Час прысьпеў; Ноч у Караліне.
13. **ПАЛАЦ. Палац (1996):** Як пайду я ў новую канюшню; Каваль; Русалкі; Манечка; Merry Christmas (LIVE); Ой долам, долам (LIVE); Ой рана, рана; Хрыстос нарадзіўся; Калядка; Каліначка; Страла.
14. **Песьні беларускіх бардаў (1992):** Кася Камоцкая, Вальжына Цярэшчанка, Алесь Камоцкі; Сяржук Сокалаў-Воюш «Песьні касінэраў».
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ:** Коцік Петрык і мышка; Пра што кукуе зязюля; Пых; Сынок з кулачок; Коцік, пеўнік і лісіца; Пшанічны каласок; Дзедава рукавічына; Пра падчарку; Пра старогаката; Як баба гуся прадавала; Сіняя сьвіта.
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА (1-3)**

**Фонахрэстаматыя, т. 1:** Беларускія канты; Песнапеньні пра Ефрасіньню Полацкую; Музыка невядомага аўтара XVIII ст. на вершы Сымона Полацкага; Помнік музычнай культуры Беларусі XVI-XVII ст. «Полацкі сшытак»; Мацей Радзівіл. Дывэртысмэнт у трох частках; Еган Давід Голянд (лібрэта М.Радзівіла). Опэра «Агатка, або прыезд Пана» (1784 г.); «Нясьвіская мэса» 1730 г. (фрагмэнт); Тадэвуш Касьцюшка (1745-1817). Паланэз; Восіп Казлоўскі (1757-1831); Міхал Клеафас Агінскі (1765-1833). Паланэз Фа мінор, Паланэз Ля мінор «Разьвітаньне з Радзімай»; Міхал Казімер Агінскі (1730-1800). Са сшытку рамансаў «Да Касі»; Эрнэст Вонжура. Увэртура да балетнай пантамімы «Арлекін-нявольнік».

**Фонахрэстаматыя, т. 2:** Л.Шлег (словы народныя). Лубок; Д.Смольскі. Канцэртына для сола скрыпкі і аркестра; Э.Казачкоў. Увэртура для духавога аркестра; Рафаіл Бардоўскі. «Апалён-заканадаўца», лібрэта М.Цяцерскага.

**Фонахрэстаматыя, т. 3:** А.Бандарэнка, словы. Мітрапаліта Кіеўскага Ларывона. Пахвала Вялікаму князю Ўладзімеру Сьвятаслававічу; А.Мдзівані (словы народныя). Гусалькі; А.Багатыроў. Маладыя гады; В.Войцік. Сюіта ў старадаўнім стылі для цымбалаў; М.Чуркін. Калыханка для скрыпкі і фартэпіяна; Л.Мурашка. Саната для фартэпіяна.

*Для атрыманьня адной касэты неабходна даслаць 22.000 руб. на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу. Не забудзьцеся падаць Ваш адрас.*




**Абед** – строгая дыета ці кепскі апэтыт.

**Аблокі** – упадак сілаў, памылка; хмары – дабрабыт.

**Абразы** – весялосьць.

**Абутак** – дарога, быць басанож – кепскія справы; кепскі абутак – ненадзейны намер.

**Абцасы стаптаныя** – зьмены ў справах.

**Абэліск** – выгада; стаяць на вяршыні – гонар.

**Абярог атрымаць** – скарыстацца выпадковымі выгадамі.

**Агонь** – дарэмная мара; моцнае полымя – пачатак выкананьня намеру; агонь у небе – зьмена кіраўніцтва; які ўпаў зь неба – сум; які блукае – гутарка ў грамадзтве; дом, які гарыць, – небясьпека.

**Аловак чыніць** – радасьць; пісаць – навіны.

**Арла бачыць** – посьпех; які перасьледуе здабычу – перамога ў справе.

**Асіпнуць у сьне** – хвароба.

**Атрута** прынятая – гора; даць яе каму-небудзь – сталасьць і цьвёрдасьць характару.

**Бацьку** бачыць памерлым – хвароба ці страта спадчыны; з памерлым размаўляць – трэба памінаць; спрачацца зь ім – упадак сілаў.

**Бачыцца з памерлымі** – новае каханьне.

**Бойку бачыць** – дабрабыт.

**Бруд** – бяда; але калі ў сябе дома – дабрабыт.

**Бульбу** варыць – задавальненьне; капаць – весялосьць; есьці – спатканьне зь сябрам; смажыць – вясельле.

**Вагон бачыць** – цяжкасьці, калі ён не на рэйках.

**Вадаспад** – навіны.

**Вадой** умывацца – радасьць; паліваць штосьці – сум.

**Ваду** чыстую – дабрабыт; каламутную – сум; халодную – здароўе; піць ваду – сум; кінуцца ў ваду – Вас будуць перасьледаваць; пагружацца ў ваду – цяжкае становішча; мыць рукі – цяжкае становішча; для здаровага – адпачынак.

**Вазу, урну** – чуткі пра памерлага; з кветкамі, на высокім месцы – нечаканы гонар; з пладамі – посьпех.

**Вайну бачыць** – сварка.

**Вакацыі** – задавальненьне, зьмяшанае зь неспакоем.

**Вакзал** – задавальненьне.

**Вакно**. Адчыненае – шкадаваньне; упасьці зь яго – сварка да бойкі; зачыненае – сум; лезьці ў сваю кватэру праз вакно – працяглая хвароба.

**Вал, насып і іншае ўзвышанае месца** – цяжкасьці ў справе ці перашкоды; упасьці з валу – Вы займаецеся небясьпечнаю працай.

**Валёнкі**. Шмат людзей у валёнках і Вы самі ў іх – зьмены адносінаў да лепшага ці да горшага.

**Валошкі рваць** – зьмены ў справах.

**Валяцца ў брудзе** – прыбытак.

**Вар піць** – шчасьце.

**Варажыць** – посьпех у справах.

**Вараную рыбу есьці** – незадавальненьне.

**Вараную ялавічыну есьці** – страты.

**Вараныя яблыкі** – радасьць.

**Вароху бачыць** – радасьць.

**Вартаваць кагосьці** – нечаканасьць.

**Варштат** – Вы зоймецеся складанай і нуднай справай, але скончыце яе.

**Варыць піва** – атрымаць лішак за працу.

**Вата**. Набіваць вату ў рот і вушы – знак будучых забаваў; есьці вату – сямейныя непрыемнасьці; падшываць вату – ад'езд прыязьніка.

**Вафлі есьці** – зьмена ў справах.

**Верас**. Быць у месцы, пакрытым верасам – быць падманутым.

**Верацяно** – радасьць.

**Весьнічкі** – нечаканае прыніжэньне.

**Весялосьць** – прадвесьце небясьпекі.

**Вечарына,** на якой Вы весяліцеся – хуткі галаўны боль.

**Возера**. Упасьці ў яго – сьмерць.

**Волата бачыць,** які сядзіць – посьпех у справах; які нападае – кепская думка кіраўніцтва; калі бачыць волата, які пацярпеў паразу – падман у надзеі; цалавацца з волатам для мужчыны – бязладзьдзе з-за перавагі жанчыны; для жанчыны волат, калі ён ласкавы ды спакойны – усё добра.

**Вінныя ягады** – нечаканасьць.

**Віно** наліваць белае – радасьць; чырвонае – бойка; піць каламутнае – сум; піць увогуле – абвінавачваньне.

**Вішні** – дарэмнае чаканьне.

**Вішнёвае дрэва садзіць** – багацьце.

**Вішнёвы настой** піць – псаваньне страўніка; частаваць каго-небудзь – абраза.

**Вожык** – сварка, паянка; трымаць у рках – хітрыкі.

**Войска** – згуба.

**Воўк** – сварка; паляваць на ваўкоў – выкрыцьцё змовы; быць у іхнай зграі – пагроза; забіць ваўка – сьмерць ворагу; чуць вой – галеча.

**Вошаў бачыць** – атрыманьне грошай; біць – нечаканасьць; шмат бачыць – хвароба.

**Вугаль цягаць** – цяжкі занятак.

**Выкрайка** – паветраныя замкі, якія Вас пацешаць.

**Выліваць што-небудзь** – няўдача.

**Вымачыцца** – мэлянхолія.

**Выпрабоўваць каго** – прыбытак.

**Выстава** – посьпех у справах.

**Вышываць** – хлусьня.

**Вышытая сукня** – радасьць.

**Вэрмішэля** – дабрабыт.

**Вядзьмарка** – нечаканасьць.

**Вяндліна ў шынках** – вяртаньне багатых родзічаў.

**Вянок** – посьпех у справах; з кветак – добрае сужэнства.

**Вянчаньне бачыць** – новае знаёмства.

**Вянчацца** – радасьць.

**Вярблюда** – шчасьлівая вандроўка; які паваліўся – перашкоды ў дарозе.

**Вярбу ў руках трымаць** – радасьць.

**Вяроўку павешаную й выцягнутую** – атрыманьне ліста; шматок вяроўкі – атрыманьне адказу.

**Вярыгі мець на целе** – з Вамі абыдуцца крывадушна.

**Вясёлка** – падман, маркота.

**Вясёлы абед** – хвароба.

**Вясёлых людзей бачыць** – радасьць.

**Вясёлыя кнігі чытаць** – шчасьце.

**Вясельле**. Быць на ім – душэўны смутак; быць сьведкам сваркі на ім – паведамленьне пра сьмерць; вянчацца з жонкай ці мужам – сьмерць; быць сьведкам вянчаньня ў царкве – сумны стан духу.

**Вячэраць аднаму** – кепскі роздум.

**Гадзіньнік** добры – здароўе; паламаны – пашкоджаньне цела ці вушны боль; разьбіць яго – сьмерць родзіча.

**Газэты чытаць** – сум.

**Галубоў** дома бачыць – сямейнае задавальненьне; есьці іх – сум; голуба з рук выпускаць – расстаньне; голуба з галубкай бачыць – вясельле.

**Гальлё, якое палае** – спакой; хадзіць па ім – пэўнае пагаршэньне справы.

**Гальштук** надзяваць – прагуляная справа; разьвязваць – вызваленьне ад працы.

**Гара**. Лезьці на гару – цяжкі посьпех; зьбягаць зь яе – пазбавіцца ад небясьпекі; быць на гары – заслужыць павагу.

**Гарбату** піць – мэлянхолія, выпадковая плётка; садзіць яе – вытрымка.

**Гардэроб з сукнямі** – страта месца ці грошай.

**Гарчыцу** – сум, сварка, спрэчка; гарчыцу на целе – нечаканы посьпех.

**Гарод з гароднінай** – выкананьне самалюбнага намеру.

**Гарох** есьці – поўны посьпех; сухі – шкадаваньне.

**Гаршкі біць** – дабрабыт.

**Гарэлку** піць – сорам; настойку – памылка; бачыць гандляра віном – кепскае знаёмства; бачыць яго, калі ён прадае гарэлку – сьмерць.

**Гасьцей бачыць і прымаць** – нянавісьць.

**Гатаваць есьці** – поўнае спрыяньне ў справах іншым, вельмі вернае й прыбытковае як для сябе, так і для іншых.

**Гвазьдзікі рваць** – нараджэньне жывога немаўляці ў Вашым родзе.

**Герань**. Гаршчок герані несьці на галаве – мець слушную надзею на цяжарнасьць жонкі.

**Герб** – моцны галаўны боль ад чаду.

**Гімн** – наладжваньне якой-небудзь сьвецкай вечарынкі разам зь сябрамі.

**Гітару бачыць** – выкананьне жаданьняў.

**Гнілыя зубы** – сварка.

*(Працяг будзе)*

## ЗРАБІ САМ

# Складны фатэль



Прыгожы й лёгкі складны фатэль для саду ці вэранды Вы бачыце на мал. 1А. Для яго спатрэбіцца прыблізна 10 паг. м рэйкі кшталту штыкетніка зь сячэньнем 20 x 40 ці 20 x 50 мм, каля 1,5 м тэнтавага сукна, парусіны ці іншага трывалага матэрыялу (пры шырыні 90 см), 6 нітаў (балтоў) дыямэтрам 6-8 мм і даўжынёй 50-60 мм (з паўкруглай плешкай), шрубы з патаемнай плешкай і цьвікі для мэблі. Трэба таксама падрыхтаваць 4 мэталёвыя ці драўляныя ліштвы (планкі) памерам 163 x 15 x 2 мм. Яны павінны надаць канструкцыі неабходную ўстойлівасьць (вузел б).

Пачніце з вырабу бакавінаў фатэлю. Потым падрыхтуйце П-падобныя апоры сядзеньня (паз. 1, 2). Зьвярніце ўвагу, што іх ножкі не паралельныя, бо апоры павінны перакрыжоўвацца. Верхнія рэбры брускоў, на якія нацягваецца сядзеньне, павінныя быць скругленыя, бо іначай тканіна з бакоў хутка пратрэцца.

Прасьвідруйце адтуліны пад ніты ў пазначаных месцах і, перш чым пачаць зборку, апрацуйце дэталі. Калі дрэва новае і мае прыгожую фактуру, яго дастаткова зачысьціць наждакам і пакрыць бясколерным лякам. Прыгожа будзе выглядаць фатэль, пафарбаваны эмалявай фарбай пад тон тканіны. Перад пакрыцьцём фарбай прашпаклюйце ўсе няроўнасьці, дайце шпаклёўцы высахнуць, зачысьціце паверхню наждаком, пакрыйце грунтоўкай.

**Зборка**. Змацуйце нітамі апоры сядзеньня з ножкамі бакавінаў так, як паказана на малюнку (вузел в). Зрабіце выкрайку сядзеньня памерам 430 x 600 мм. Падсячыце краі матэрыялу на швачнай машынцы швом "зігзаг", бо інакш матэрыял можа лопнуць). Прыбейце тканіну цьвікамі для мэблі. Змацуйце гатовае сядзеньне нітамі з бакавінамі фатэлю й пастаўце яго ў працоўнае становішча. Пры гэтым тканіна сядзеньня павінна быць добра нацягнутай. Адзначце мацаваньне мэталёвых ліштваў і пастаўце іх на шрубы так, каб планкі адносна шчыльна датыкаліся да драўляных паверхняў. Шрубы выбірайце таўсьцейшыя, з паўкруглай плешкай. Для трываласьці стаўце іх на клей. У апошнюю чаргу скройце з тканіны сьпінку (220 x 600 мм) і прыбейце яе.

Да гатовага фатэлю збоку Вы можаце прымацаваць кішэню для газэтаў і часопісаў, выкраіўшы яе з такой самай тканіны. Памеры ейныя пададзены на малюнку. Зьверху маленькай кішэні прышыйце яшчэ меншую для алоўкаў, сонцаахоўных акуляраў і рознае дробязі. У верхні край кішэні ўшыйце ліштву даўжынёй 300 мм і таўшчынёй 10 мм. Устаўце ў яе мэталёвыя дужкі й навесьце іх на зашмаргі, што ўбіты ў падлакотнік.

Скончыце працу над фатэлем афарбоўкай мэталёвых частак – ліштваў, плешак нітаў, зашмаргаў, дужак.

# Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне

*Працяг. Пачатак у "Інфарматары N12"*

**Рухавік**

Рухавік павінен быць сухім і чыстым. Забруджаны алеем рухавік негэрмэтычны і сьведчыць пра кепскі догляд за ім. Агледзьце яго зьнізу. Адпаліраваны да бляску рухавік з новенькімі пластмасавымі й гумавымі дэталямі выглядае вельмі падазрона.

Рухавік павінен завесьціся адразу й на халастым ходзе працаваць ціха, раўнамерна. Колькасьць зваротаў не павінна адвольна павялічвацца ці зьмяншацца.

Калі да аўтамабілю дадаецца дыяграма кампрэсіі, прасачыце за тым, каб значэньні на дыяграме былі аднолькава высокімі для ўсіх цыліндраў (тое самае і для дызэльных аўтамабіляў).

Гермэтычнасьць выхлапной трубы лёгка праверыць, заторкнуўшы выхадную адтуліну анучай ці абцасам бота. Калі з трубой усё добра, рухавік заглохне праз некалькі сэкундаў. Праверце, ці не карадаваная выхлапная труба, ці няма на ёй іржы – новая выпускная сыстэма каштуе дорага.

На дэфэкт у поршневых кольцах паказваюць газы, што выходзяць з гарлавіны для заліўкі алею пры адтуленай накрыўцы. Жорсткі стук у рухавіку папярэджвае пра хуткую ягоную паломку. Бліскучыя часьцінкі мэталю на шчупе алеямеру сьведчаць пра зношанасьць падшыпніка.

Праверце радыятар і шлянгі. Ахаладжальная вадкасьць не павінна быць ні алеістай, ні іржавай. Ушчыльненьне галоўкі цыліндру негермэтычна, калі падчас працы рухавіка ахаладжальная вадкасьць бурліць.

Акумулятар не павінен мець расколінаў, штыры полюсаў мусяць быць змазанымі. Пракантралюйце ўзровень электраліту. Тэрмін службы акумулятара ад двух да шасьці гадоў. Дата (месяц і год) вырабу часта пазначаная на самім акумулятары.

**Трансмісія**

Ход счапленьня не павінен перавышаць трох сантымэтраў і перадачы павінны пераключацца лёгка, бяз скрыгату. Калі гэта ня так, то счапленьне працуе кепска. Каб вызначыць, ці спраўна функцыянуе счапленьне, уключыце другую перадачу і пры паднятымі да канца ручным гальме (тормазе) апусьціце пэдаль счапленьня. Калі матор працягвае працаваць, можаце быць пераканаы – дыск счапленьня спрацаваўся.

Калі пры пераключэньні перадачаў падчас выпрабавальнай язды чуваць скрыгат ці пераключальнік хуткасьцяў заядае, значыць сынхранізатары моцна зношаныя.

**Хадавая частка**

У добрых шынаў глыбіня пратэктару павінна быць ня меншай за 4 мм. Шыны мусяць быць адной маркі, памеру і тыпу. Не забудзьцеся агледзець і запаснае кола. Прычынай аднабаковага зносу пратэктару можа быць няслушная восевая геамэтрыя колаў, і тады варта памераць адлегласьць паміж восямі правых і левых колаў.

Амартызатары спрацаваліся, калі на поршневым штоку зьяўляецца вадкасьць, а буфэрная трубка пакрыта алеем. Раўнамерна разьмеркаваная па ўсёй паверхні шынаў эрозія пратэктара таксама сьведчыць пра нягоднасьць амартызатара.

Пра жыцьцёвую важнасьць гальма казаць залішне. Правяраючы гальмавую (тармазную) сыстэму, не палянуйцеся зьняць пярэдняе, кола, каб пераканацца: гальмавая калодка мае таўшчыню ня меншую за 5 мм, а на гальмавых дысках няма ўвагнутасьцяў і празьмерна глыбокіх разораў.

Стырнавое кола павінна мець вольны ход уздоўж восі кручэньня прыблізна ў два-тры пальцы. Пры руху аўтамабілю стырно павінна займаць цэнтральнае становішча.

**Выпрабавальны выезд**

Для выпрабавальнага выезду найперш абярыце такі кавалак шляху, дзе можна праверыць усё: найбольшую хуткасьць на роўным кавалку, здольнасьць машыны пераадольваць пад'ём, ейную ўстойлівасьць на паваротах. Таксама варта праехаць і па кепскім кавалку дарогі – адразу высьветліцца, што грукоча й дзе хлопае.

Увага! Калі падчас выпрабавальнай язды адбылася аварыя, усе зьвязаныя з гэтым праблемы ўладжваюцца аўтакрамай (ці прыватным прадаўцом). Вядома, калі Вы самі не зрабілі грубых памылак ці не стварылі аварыю наўмысна.

Падчас язды выключыце радыё й абдзіманьне, каб лепш чуць. Пераканайцеся, што на халастым ходзе рухавік ня глохне й паслухмяна рэагуе на націск пэдалі аксэлератару.

Пры гальмаваньні з вольна пакінутым стырном (рабіце гэта толькі на бясьпечным кавалку дарогі) аўтамабіль на хуткасьці 40 км/г павінен захаваць кірунак руху. Гальмавая пэдаль, націснутая да канца, не павінна дакранацца да падлогі. Калі падчас гальмаваньня чуваць стук ці мэталёвы скрыгат, спраўдзьце наяўнасьць гальмавой вадкасьці й ступень зносу гальмавых калодак.

Ручныя гальмаўцы мусяць лёгка адціскацца ўверх і надзейна блякаваць заднія колы пры павольным руху аўтамабілю. Адціск ручных гальмаўцоў звычайна абмежаваны чатырма-пяцьцю шчаўчкамі.

Памятайце, што колавыя дыскі з дэфэктамі ці дысбаланс колаў выклікаюць прыкметную вібрацыю стырнавога кіраваньня.

Калі пры павольным руху ў рухавіку праслухоўваецца трэск, значыць у выхлапную трубу трапіла незгарэлая сумесь. Прычыны могуць быць такія: негермэтычнасьць выпускных клапанаў, прарываньне запальваньня з-за няслушна ўтворанай сумесі ці дэфэкту ў самой сыстэме запальваньня. Калі ў рэжыме павольнага руху выхлапная труба "чадзіць", рэч найхутчэй у празьмерным зносе клапанаў і поршневых колаў, вынікам чаго стане празьмерны расход алею.

***Практычныя парады***

**Аўтамабілі з каталізатарам**

"Каталізатар" – грэцкае слова і ў перакладзе значыць "разбуральнік", "узбуджальнік". У нашым выпадку гаворка ідзе пра ўзбуджальнік хімічнай рэакцыі. У выхлапную сыстэму ўбудоўваецца керамічны носьбіт з мэмбранамі, на якія нанесены атамарны слой шляхетнага мэталю. Шкодныя рэчывы, што ўтвараюцца пры спальваньні паліва, праходзячы праз мэмбраны, ператвараюцца ў бясшкодныя газы.

Для аўтамабілю з каталізатарам патрабуецца досыць рэдкае паліва без сьвінцу – нармальны бэнзын безь сьвінцу ці "супэрбэнзын" безь сьвінцу.

Зьвярніце ўвагу на тое, каб выбраны Вамі аўтамабіль ня меў каталізатару й мог працаваць на звыклым, са сьвінцом, паліве. Тое самае датычыцца й машынаў з дызэльным рухавіком.

*(Працяг будзе)*

# ЗАНЯТКІ ПСЫХАТРЭНІНГУ

Заняткі псыхатрэнінгу нам дапамагае весьці Вірджынія Сатыр, выбітная амэрыканская спэцыялістка ў галіне сямейнае тэрапіі.

Часта складанасьці ў сям'і ўзьнікаюць ужо пры яе стварэньні. У першы год сумеснага жыцьця актыўна фармуецца стыль сужэнскіх зносінаў, правілы паводзінаў. Асаблівасьці такіх паводзінаў, якія афармляюцца ў пачатковы пэрыяд сумеснага жыцьця, далей зь цяжкасьцю паддаюцца карэкцыі, патрабуюць значных намаганьняў для іхнага зьмяненьня ў выпадках, калі яны не адпавядаюць нормам сямейных паводзінаў.

Нягледзячы на тое, што зьмяніць непрыдатны стыль паводзінаў цяжка, усё ж пры псыхалягічна пісьменным падыходзе пры ўзаемным жаданьні гэта зрабіць магчыма. Першае, што варта зрабіць — гэта ўсьвядоміць, што Ваша сям'я мае нейкія праблемы. Другое — Вы павінны глыбока адчуць і паверыць у тое, што становішча справаў у Вашай сям'і можа быць зьмененае, але дзеля гэтага патрэбны час і цярпеньне. Трэцяе — Вам трэба пачаць актыўна дзейнічаць, каб зьмяніць сытуацыю, ажыцьцявіць карэкцыю сямейных паводзінаў.

Такім чынам, якім будзе Ваш першы крок? Паспрабуйце зладзіць такі экспэрымэнт. Займіце зручнае становішча ў фатэлі ці на канапе. Выпрастайце ногі, паспрабуйце крыху разьняволіцца й падумаць пра сябе. Не варушыце ў памяці крыўдныя словы, не вяртайцеся да змрочных успамінаў. Глыбока ўздыхніце й спытайце сябе: "Хто я? Які(-ая) я?".

Падумайце пра сябе ў такія моманты, калі Вы сабе падабаецеся. Можа быць, у Вас ёсьць цікавая праца, якая заўсёды прыносіць Вам задавальненьне. А можа, вы прыгадаеце камплімэнты з нагоды Вашага вонкавага выгляду ці той момант, калі Вы каму-небудзь зрабілі прыемнае, камусьці дапамаглі. Паспрабуйце на як мага большы час засяродзіцца на Вашых пачуцьцях у такія моманты, і Вы зразумееце, што значыць адчуваць сваю высокую самакаштоўнасьць.

А цяпер прыгадайце іншую сытуацыю: Вы дапусьцілі нейкі промах ці пасварыліся з супрацоўнікамі, апынуліся ў разгубленым стане пасьля нейкага ўчынку Вашага дзіцяці. Гэтыя ўспаміны прынясуць Вам боль, але Вы зразумееце, што значыць адчуць сваю нізкую самакаштоўнасьць.

Што значыць гэтае малазнаёмае для нас слова? Мы часьцей прызвычаіліся да больш зразумелага слова "самаацэнка". Самакаштоўнасьць — галоўны псыхалягічны чыньнік, які вызначае ўсё тое, што адбываецца нябачна для іншых, унутры ўласнага душэўнага сьвету, праступаючы праз адносіны зь іншымі людзьмі, праз нашыя паводзіны. Гэта выява самога сябе, сваёй асабовай значнасьці. Пачуцьцё самакаштоўнасьці фармуецца й мяняецца ўвесь час на працягу ўсяго жыцьця чалавека. Яно залежыць ад нашых посьпехаў і няўдачаў. Калі самакаштоўнасьць ёсьць адчуваньнем значнасьці сябе ў канкрэтнай сытуацыі, то самаацэнка — гэта ацэнка сваіх магчымасьцяў, асабовых якасьцяў і месца сярод іншых людзей незалежна ад канкрэтнай сытуацыі.

Самаацэнка добра выяўляецца ў працэсе ўзаемнага пазнаваньня ў першы год сумеснага жыцьця. На жаль, часта нават пры ўзаемным каханьні сужэнцы ня ведаюць сапраўднай сутнасьці, г. зн. "твару" адзно аднаго, не імкнуцца яго ведаць і нават хаваюць яго. Чаму ўзнікае патрэба схаваць свае асаблівасьці й нежаданьне даведацца болей пра партнэра? Часьцей за ўсё гэта зьвязана менавіта з адсутнасьцю правільнай самаацэнкі, а наяўнасьцю празьмерна завышанай ці заніжанай. Заніжаная самаацэнка выклікае боязь таго, што веданьне разбурыць каханьне ("За што мяне кахаць, калі ведаць глыбей?"), а завышаная выклікае імкненьне "ўціснуць" партнэра ва ўяўны вобраз, не прымаючы ва ўлік ягоную асабовасьць, тое, што ён насамрэч іншы, а не такі, якім яго прыдумалі ("Хай будзе такім, якім мне хочацца, тады я буду яго каханць"). Такога кшталту арыентацыі зь цягам часу прыводзяць да расчараваньня, таму трэба імкнуцца да ўзаемаразуменьня. Лепш працэс узаемнага пазнаваньня пачаць з аповеду пра тое, якімі Вы былі ў дзяцінстве. Гэта можа быць уласны аповед пра сябе ці аповед бацькоў пра Вас.

Чалавек, чыя самакаштоўнасьць высокая, адчувае сябе неабходным: ён давярае самому сабе і здольны прасіць у цяжкую хвіліну дапамогі ад іншых. Толькі прымаючы сваю ўласную высокую каштоўнасьць, мы здольныя бачыць, прымаць і паважаць высокую каштоўнасьць іншых. Такіх людзей можна назваць сапраўды актыўнымі. Але калі жыцьцё ставіць перад імі складаныя пытаньні, калі ўзьнікае стан стомленасьці, а праблемы ўзрастаюць і патрабуюць свайго разьвязаньня, гэтыя людзі таксама могуць занізіць сваю самакаштоўнасьць. Аднак яны разумеюць, што гэта часовы стан, і таму не камплексуюць і не імкнуцца схаваць ці падавіць свае пачуцьці.

Жыцьцё людзей зь нізкай самакаштоўнасьцю суправаджаецца чаканьнем падману, абразы з боку навакольных. Абараняючы сябе, такія людзі хаваюцца за мурам недаверу, ізалюючы сябе ад астатніх. Адсюль абыякавасьць да саміх сябе і ўсяго, што іх атачае, апатыя. Становіцца цяжка разумець іншых людзей і прымаць самастойнае рашэньне, таму яны ці прыніжаюцца перад іншымі, сьлепа ім падпарадкоўваюцца, ці... дэспатычна падаўляюць іншых.

Якую самакаштоўнасьць стварае Ваша сям'я, Вы можаце праверыць, калі зробіце невялікі экспэрымэнт.

Увечары ці ў выхадны дзень, калі ўся Ваша сям'я зьбярэцца, напрыклад, за абедзеным сталом, паспрабуйце ўявіць, што адбываецца з Вашай самакаштоўнасьцю, калі Вы размаўляеце адзін з адным. Натуральна, будзе шмат рэплік, непасрэдна недатычных праявы самакаштоўнасьці. Аднак Вас, напрыклад, можа зьдзівіць, калі Вы заўважыце, што нават такая просьба, як "перадай, калі ласка, соль", выкліча ў Вас пачуцьцё прыніжанасьці ці каштоўнасьці ў залежнасьці ад тону голасу, мімікі, жэстаў, а таксама ад таго, у які час яна сказаная. Можа, гэта было сказана, калі Вы самі зьбіраліся нешта сказаць, а Вас перапынілі й тым самым выказалі поўную абыякавасьць да таго, што Вы зьбіраліся сказаць.

Калі Ваша вячэра ці абед будзе падыходзіць да сярэдзіны, паслухайце сябе й прасачыце за тым, што і як Вы самі кажаце сваім блізкім. Ці даюць Вашы рэплікі магчымасьць ім адчуць сябе лепей датычна да саміх сябе? Праверце, як іхныя адказы, міміка адпавядаюць Вашым "пасланьням". Калі Вашы намеры й зваротная рэакцыя супадаюць, гэта значыць, што Вы добра ўсьведамляеце сэнс Вашых "пасланьняў" і іхны ўплыў на самакаштоўнасьць Вашых блізкіх. Калі ж яны не супадаюць, значыць, Ваш твар, міміка, інтанацыя падаюць такія "пасланьні", якія Вы самі не ўсьведамляеце. Пасьля таго, як Вы самі зробіце гэта, паспрабуйце прыцягнуць да гэтага Вашу сям'ю. Пасьля абеду, вячэры абмяркуйце разам усё, што заўважылі, адчулі.

Зьвярніце ўвагу, што ёсьць шэраг выказваньняў, якія зьніжаюць самакаштоўнасьць і самаацэнку, прыводзяць да назапашваньня раздражненьняў. Да іх ліку належаць наступныя:

Я тысячу разоў табе казаў, што...
Пра што ты толькі думаеш...
Няўжо табе цяжка запомніць, што...
Няўжо ты не разумееш, што...
Колькі разоў трэба паўтараць..
Няўжо ты ня бачыш, што...
Усе людзі (якія) так сябе паводзяць, а ты...
Ты стаў такім (сумным, грубым, няўважлівым...)
Ну што за сябры ў цябе...
Ну, да каго ты падобны(-ая)...
Што ты да мяне прычапіўся(-лася)...
Ты такая самая (такі самы), як твае бацькі, таксама...

Паспрабуце пазьбягаць гэтых выказваньняў, а часьцей выкарыстоўвайце тыя, якія павышаюць самакаштоўнасьць і фармуюць нармальную самаацэнку.

Ты ў мяне самая прыгожая...
З табой мне так лёгка...
Я нікому так ня веру, як табе...
Ты ў мяне самы разумны...
Парай мне, калі ласка...
Ты мяне заўсёды добра разумееш...
У мяне няма нікога бліжэйшага за цябе...
Парай мне, ты ж так добра ведаеш...
Ты ў мяне малайчына...
Як я табе ўдзячны(-ая)
Я б ніколі ня змог (не змагла) зрабіць гэта так добра, як ты...
Якія ў цябе цудоўныя сябры...

Магчыма, Вы знойдзеце і іншыя словы й шляхі для павышэньня самакаштоўнасьці. Жадаем посьпехаў!

# БІЛЬЯРД

*ЗАНЯТАК 1*

**ЗНАЁМСТВА ЗЬ БІЛЬЯРДНАЙ ЗАЛЯЙ**

Гуляюць у більярд у адмысловым памяшканьні, якое называецца більярднай ці більярднай заляй. Яно павінна быць сьветлым, сухім, з высокай стольлю (не ніжэйшым за 4 м) і з добрай вэнтыляцыйнай сыстэмай. Велічыня памяшканьня залежыць ад велічыні більярдных сталоў і іхнай колькасьці. Адлегласьць ад кожнага стала да сьцяны ці да месцаў разьмяшчэньня гледачоў (канапаў, лаваў, крэслаў) павінна быць ня меншай за 1,75 м. Калі ў памяшканьні стаіць некалькі сталоў, то адлегласьць паміж бартамі сталоў, што стаяць побач, павінна быць ня меншай за 2 м.

Да більярднага інвэнтару напежаць: більярдны стол, кіі, шары, машынка, мазік, палічкі для шароў і кіёў, дошка для запісу й драўляны роўнабаковы трохкутнік.

**Більярдны стол** можа быць разнастайных памераў. Найбольшае распаўсюджваньне з лузных більярдаў для дарослых атрымалі:

поўны стол 3,6 x 1,8 м,
вялікі стол 3,5 x 1,75 м,
сярэдні стол 3,2 x 1,6 м,
малы стол 2,9 x 1,45 м.

Памер стала лічыцца паводле пэрпэндыкуляра ад верхняга абрэзу гумы супрацьлеглых бартоў. Суадносіны даўжыні стала да ягонае шырыні павінны быць 2:1.

Найлепшы стол, што адпавядае ўсім патрабаваньням высокакваліфікаванай гульні, — вялікі більярд 3,5 x 1,75 м з вышынёй ад падлогі да верхняга краю дошкі 0,8 м.

Аснова стала – падстольле на шасьці драўляных ножках. У аснове кожнае ножкі каля падлогі ёсьць гайкі на разьбе, з дапамогай якіх паверхня стала ўсталёўваецца строга гарызантальна. На падстольле ўкладаюцца дошкі.

У залежнасьці ад часу й месца вырабу дошкі могуць быць асьпідныя, мармуровыя, драўляныя й асфальтапекавыя. Большая частка сталоў дарэвалюцыйнага вырабу мае асьпідныя дошкі: яны ўвозіліся ў Расею з Ангельшчыны. Частка старадаўніх сталоў пакрыта драўлянымі й мармуровымі дошкамі, якія, як паказала шматгадовая практыка, маюць шэраг заганаў: падлягаюць складанай апрацоўцы, паддаюцца кліматычным уплывам, лёгка расколваюцца пры мэхнічных ударах.

На вялікі більярдны стол усталёўваюцца роўна тры ці пяць дошак таўшчынёй 3 см. Паміж сабой дошкі злучаюцца мядзянымі штыфтамі. Да падстольля дошкі прымацоўваюцца шрубамі.

На добра адшліфаваную паверхню дошак укладваецца спэцыяльная більярдная тканіна зялёнага ці блакітнага колераў. На такім тле найбольш выразна відаць белыя шары, і, акрамя таго, гульцы некалькі гадзінаў запар, не стамляючы вочы, могуць канцэнтравацца на гульні.

На мармуровыя й драўляныя дошкі пад тканіну ўкладаецца палатно. Бакі тканіны замацоўваюцца з бакоў падстольля спэцыяльнымі цьвікамі. Пасьля ўкладкі новай тканіны яе варта адпрасаваць.

З краёў стала замацоўваецца шэсьць бартоў зь цьвёрдых гатункаў дрэва. З унутранага боку бартоў прымацоўваецца гума. Паміж канцамі бартоў абсталёўваюцца чатыры кутнія і дзьве сярэднія лузы (глядзіце малюнак).




Крута замацаваныя краі бартоў, якія акантоўваюць лузы, называюцца "губы". "Губы" разьмешчаны такім чынам, што шар, не трапляючы ў лузу, можа зьмясьціцца за "губой" і, прыціснуўшыся, устаць на самым краі лузы. Пастаноўка шара на "губу" лічыцца вельмі пасьпяховым, але складаным відам удару. На більярдзе са строгімі лузамі іхны роступ павінен перавышаць дыямэтар шароў на 3-4 мм.

Поле більярднага стала адзначаецца трыма выразнымі кропкамі "1", "2" і "3" і ўмоўна падзяляецца на асобныя зоны (глядзіце малюнак).

Становішча кропак вызначаецца матэматычным шляхам: скрайнія кропкі – "1" і "3" – ляжаць на скрыжаваньні лініяў, што злучаюць сярэдзіны сярэдніх лузаў з кутнімі лузамі, што ляжаць ад іх наўскось (малыя дыяганалі). Сярэдняя кропка — "2" — знаходзіцца на перакрыжаваньні лініяў, што злучаюць сярэдзіны сярэдніх лузаў і кропак "1" і "3", а таксама лініяў, што злучаюць кутнія лузы (вялікія дыяганалі).




Праз скрайнія кропкі ўяўна праводзяцца папярочныя лініі, паралельныя да кароткіх бартоў. Зона ад лініі, што праходзіць праз кропку "1" да кароткага пярэдняга борту, адкуль робіцца першы ўдар, называецца "дом".

Сумежная з "домам" зона паміж кропкамі "1" і "3" называецца "выган", а дальняя зона за кропкай "3" носіць назву "глыбіня". Радзей сустракаюцца більярдныя сталы, у кожны кароткі борт і ў абедзьве паловы доўгіх бартоў якіх зьверху ўстаўляецца па тры "дыямэнты" — добра бачныя кропкі з трамы. Сыстэма такіх васямнаццаці кропак мае назву "дыямэнтавая сыстэма". Яна дапамагае скласьці ў думках схему ўдараў з вылічэньнем плянаванага руху гульнявых шароў.


*Мал. Ігнаса Марцінайціса*

# ШАХМАТЫ


1п. Ход белых. Ці могуць яны ўратавацца?


4п. Ход белых. Знайдзіце найкарацейшы шлях да перамогі.


2п. Ці могуць чорныя гуляць 1... Вж:d3 ?


5п. Мат у тры хады.


3п. Белыя перамагаюць.


6п. Белыя перамагаюць.

*Адказы ў наступным нумары*

**АДКАЗЫ НА ПАПЯРЭДНІЯ ЗАДАНЬНІ**

**Шахматы**

Тлумачэньні:
*Кароль* — **Кр**;
*Гетман (Фэрзь)* — **Г**;
*Вежа (Тура)* — **Вж**;
*Вышнік (Слон)* — **В**;
*Конь* — **К**.

**1п.** 1. Вж:f8+! Кр:f8 2. Гh8+ Крf7 3. Вg6+! Чорныя здаліся.

**2п.** 1... Кg5!! Белыя здаліся.

**3п.** 1... Кd3! 2. В:h7+ Крh8 3. Гh5 Кf4 4. Гh4 Кh3+! Белыя здаліся.

**4п.** 1... Вжd1!! 2. В:b7+ Крb8 3. c4 Вж:f2! з перамогай.

**5п.** 1. Кa4+! ba 2. Вжb1+ Гb5 3. Гb7+ Чорныя здаліся.

**6п.** 1. Кc8+! Чорныя здаліся.

**Забаўкі**
**1.** 6 **2.** 66 **3.** 47

# ЗАБАЎКІ

## Задача 1

Устаўце фігуру, якой не стае




## Задача 2

Падстаўце лік, якога бракуе

**148 (110) 368**
**243 ( ) 397**

## Задача 3

Падстаўце лік, якога бракуе

**2 20 42 68 ?**

*Адказы ў наступным нумары*

## Славамір Адамовіч

# «Пятая страфа»

18.06.96, рэанімацыйны бокс шпіталю КГБ. Беларусь як бэрмудзкі трохкутнік: таямнічы, небясьпечны, незразумелы. І той, хто пралятае над гняздом нашай зязюлі з чорнымі думкамі, застанецца ні з чым, і дастане паразу. А баленікі з падарожнікамі няхай лётаюць. Для моцных яны ня страшныя.

**ЁН**

**Бойся яго, ня бойся —**
**ён побач, і над, і пад.**
**Штодня ён прыходзіць у госьці,**
**твой самы старэйшы брат.**
**Ён любіць тваю жанчыну**
**і вечна прагне яшчэ,**
**ён ходзіць крокам качыным,**
**альбо — як дровы сячэ.**
**Спакойна яму і сьпіцца,**
**і соладка п'ецца яму...**
**Тутэйшы начальнік паліцыі**
**яго ня кіне ў турму.**
**Ён любіць гасіць плявочкамі**
**агмені самотных душ**
**і пільнымі шэрымі вочкамі**
**глядзець скрозь садовы плюшч.**
**Ён пляга твая адвечная,**
**штодзённы твой госьць у дом,**
**і ты, як лаза надрэчная,**
**праходзіш праверку на злом**

**АХ...**

**... проста цьвітуць пралескі,**
**проста жоўты пясок,**
**проста сьвежыя трэскі,**
**проста на дрэвах сок;**
**......................**
**......................**
**......................**
**......................**
**проста сяджу ў вязьніцы,**
**проста ем баланду,**
**проста ніяк ня сьпіцца,**
**проста нікуды ня йду;**
**проста сябры на волі,**
**проста і ворагі там,**
**проста цячэ са столі,**
**проста жыцьцё — Бэдлам;**
**проста хутка асудзяць,**
**проста буду маўчаць,**
**проста сумую па людзях,**
**проста хачу кахаць.**

Вершы з цыклю «Пятая страфа», напісаныя ў красавіку 1996-га –у СІЗО КГБ (9-я камэра). Занатаваныя з памяці 18.06.96 у рэанімацыйным боксе шпіталю КГБ.

* * *

Вы не задумваліся, чаму ўлады не выкарыстоўваюць бескантактныя сродкі стрымваньня дэманстрантаў? Правільна, уладзе патрэбны «кантакт», каб прывучыць носьбіта дубінкі, што яму дазволена рабіць з пратэстоўцамі (пікетчыкамі, сьцяганосцамі, нават калі гэтыя сьцягі – звычайныя значкі на вопратцы) усё, што заўгодна. «Кантакт» патрэбны дзеля затрыманьня найбольш актыўных, «зачыншчыкаў». Таму такія сродкі, як пажарныя вадамёты, газавыя шашкі – не падыходзяць. Бо задача рэжыму –зьбіць людзей, затрымаць, пасадзіць, а ня проста расьсеяць, разагнаць.

Усім, хто бярэ ўдзел у маім лёсе – дзякуй! Але, думаю, гэта ня толькі мая справа – справа №182. Гэта толькі фрагмэнт нашай агульнай справы – сапраўды змаганьня за сапраўды свабодную Беларусь. Слова Салідарнасьць сёньня мусібыць Галоўным Словам. Ніхто не павінен быць пакінуты па-за ўвагай, тым больш моладзь. А людзі рэжыму – яны не такія страшныя, як мы думаем. Іхняя зброя – дэзынфармацыя, адсутнасьць усялякай інфармацыі і, вядома, дубінкі. Але гэта нішто супраць нашай Волі і нашага Духу, якія мы ўмацоўваем і ў засьценках таксама, калі не найперш. Але, вядома, і на ражон лезьці ня трэба.

Галадаць я пачаў у 9-й, потым перавялі ў 10-ю, да ўжо асуджанага «блатнога». У яго – гара перадачаў, пайкі – на дзесяцёх. І ён мяне зразумеў, маё галадаваньне. Сапраўдны «блатны» і «палітычны» зразумеюць адзін аднаго, бо мы аднолькава пазбаўленыя волі. Хоць мараль у нас і розная. Таму, каб выжыць за кратамі, трэба салідарызавацца з «братвой», даваць ім прыклад таго, што за краты трапляюць ня толькі за ўкрадзены мех бульбы ці забойства... На Валадарцы сядзіць Алесь Шадрын, як мне перадалі, з нашых. Можа й яму якую пасылку хто ўзяўся б перадаць ці хоць пісьмо закінуць. Сядзіць, здаецца, за хуліганку, але гэта няважна. У яго гніюць ногі, да таго ж дрэнна бачыць.

Мае шчырыя прывітаньні берасьцейскім студэнтам і тамтэйшым тэатралам. Мы яшчэ пасядзім і за большым сталом, на якім каралевай закусак будзе бульба ў гарачым сале. Прапаную новы тост з мовы старажытных лацінянаў: Nemo me impune lacessit! Ніхто не зачэпіць мяне (нас) беспакарана!

25 чэрвеня 1996 году, Менск, шпіталь КГБ РБ, рэанімацыйны бокс.

Маім старым і новым сябрам і сяброўкам, знаёмым і незнаёмым юнакам і дзяўчатам, – беларускай моладзі, якая супраціўляецца, я адрасую гэты ліст.

Я сяджу перад расчыненым вакном шпітальнага пакою і пішу гэтыя словы. Пад вакном – яблынька зь яблычкамі на галінках, далей таксама яблыні – гэта шпітальны садок. Мэтраў за 300 ад мяне – будоўля. Будуюць другі 9-павярховы дом з дыхтоўнай чырвонай цэглы. Першы ўжо здадзены ў эксплюатацыю: у ім цяпер жывуць шышкі з мытнае службы, а таксама тыя, што разганяюць нас на мітынгах, садзяць за краты, шыюць «дело» і «статьи». Другі дом будуецца таксама для іх, для тых, каму хапае трохпакаёўкі ў 100 кв. мэтраў у доме з чырвонай цэглы. І таму я ўпэўнены, што генэрал-пракуроры прайграюць, бо ім трэба ўсяго 100 квадратаў кватэрнае плошчы, нам жа трэба ўся Беларусь, незалежны Беларускі дом, нам патрэбны свабодныя вуліцы й двары нашых гарадоў і мястэчак, нам патрэбна свабодная Панікоўка – наш Гайд-гей-парк, дзе мы можам свабодна піць «Графа Чапскага» ці «Старажытнае»...

Сёньня другі дзень як я спыніў галадоўку. Мае ноздры фільтруюць паветра, у якім я чую пах свабоды, смуроды Трактарнага й завода Вавілава, а таксама водар кавы Nescafe, якую п'е мой «целаахоўнік» – кантралёр. З апошнім мне сёньня пашанцавала: хлопец спакойны, мядзьведзяваты ў добрым сэнсе слова; зьвяртаецца на «вы» й перапрашае, калі прышпільвае мяне кайданкамі да ложка, выходзячы на перакур.



Перад пачаткам галадоўкі давялося самога сябе падстрыгаць нажніцамі. Як гэта ні дзіўна, у ізалятары стрыжка за казённы кошт не прадугледжана. Цяпер я лысы, але затое з барадой. Далібог, чачэнец якісьці, і менш за ўсё падобны на «пісьменьніка».

Для чаго ж патрэбна была галадоўка? Для таго, каб выказаць салідарнасьць з Вамі, хто застаўся на волі і йшоў на дубінкі рэжыму. Для таго, каб праверыць сябе яшчэ раз на гнілату й яшчэ адну кроплю сьмярдзючага раба выціснуць зь сябе разам з апошняй кропляй поту. Для таго, каб даць інфармацыю пра сябе на волю.

Вызначаць маю галадоўку як пратэст – гэта не зусім слушна. Пратэст – слова досыць мяккае. Пратэставаць можна, калі вам у грамадзкім транспарце наступілі на нагу. Мая ж галадоўка – гэта маё Супраціўленьне. Гэта нашае Супраціўленьне наяўнымі сродкамі.

На пятыя суткі сухой галадоўкі я перастаў адчуваць свой пах –скура высахла, поту не было. На шостыя пачала адвісаць сківаца, язык пачаў пухнуць і вылазіць на зубы. Потым думкі пра эратычнае ўжо не выклікалі ніякай рэакцыі арганізму... 12-га раніцай я мусіў выпіць чаю, каб магчы гаварыць з прадстаўніком прэсы. Цяпер я выходжу з галадоўкі. Дзякуй дактарам і сястрычкам, якія завіхаюцца ля мяне й цалкам на маім баку! Я яшчэ раз упэўніўся, што калі ты гатовы – не, ня тое, што жадаеш, але гатовы падохнуць, загнуцца, памерці не за 100 квадратаў трохпакаёўкі, не за тхло «баксаў» і г.д., але за сваю праўду, значыць сьвет яшчэ ня стаў дагары нагамі, і, значыць, Свабода, Бацькаўшчына, Незалежнасьць – не эфэмэрыды паэтаў, а самая рэальная рэальнасьць. Зрэшты, не пра мяне рэч. Мы павінны гаварыць слова «Мы». Мы ня мусім баяцца, бо нас вядзе наша Воля, наш Дух Свабоды.

У шпіталі мяне ахоўваюць кантралёры СІЗО: адзін – днём, два –уначы. На «ўзбраеньні» ў іх – дубінка-электрашокер, табельны пісталет у кожнага, ручныя кайданкі, і кайданы, злучаныя мэталёвым тросікам мэтровай даўжыні. Спачатку, калі мяне толькі прывезьлі, калі я быў і без таго ня здатны рабіць нейкія неадэкватныя рухі пасьля 8-мі сутак усыханьня, кантралёры сумленна выконвалі свае абавязкі й прыкоўвалі мяне на ноч да ложка. Потым «шум» у прэсе зрабіў сваю справу: маім «целаахоўнікам» стала зразумела, хто я і за што сяджу. «Оковы пали».

А цяпер 2 адказы на 2 пытаньні. Мой сьледчы, які, дарэчы, прасіў у мяне адводу, 2.04.96 спытаў, чаму гэта ў нас (у шэрагах БНФ, сярод тых, хто супраціўляецца рэжыму) так многа псыхічна ненармальных. На гэтае пытаньне адкажу так: вы атрымаеце на сваё пытаньне адказ у Беларускім Судзе, які справядліва спытае з кожнага, хто сёньня служыць антыбеларускаму рэжыму. А вось і адказ грамадзяніну пракурору, які ў час маёй сустрэчы з прадстаўніком прэсы 12.06 спытаў, чаму я не люблю (ненавіджу) людзей. Ах, пракурор, пракурор, людзей я люблю. Я люблю маіх сяброў, люблю наіўных і шчырых, люблю, хто любіць мяне, люблю аматараў піва, рок-н-ролу й музыкі тоўстых, люблю маіх сяброў Махмуда й Краўца, Далі і Д'Артаньяна, люблю тусоўшчыкаў цэнтра і ўскраіны, люблю маіх былых і будучых жонак... Многіх людзей люблю, нават таго маладога кантаралёрчыка, які ўсё запэўнівае мяне, што ўсё ў маёй справе скончыцца добра... Але чым больш я люблю, тым больш ненавіджу двуногую сволач, якая за 100 квадратаў зь бідэ прадае, топча наша самае сьвятое: нашую дзяржаўнасьць, нашыя сымбалі, нашае слова, нашую Бацькаўшчыну...

Будзьце рацыянальнымі, але будзьце й крыху наіўнымі, мае сябры й сяброўкі, каб магчы радавацца самаму малому ў гэтым жыцьці! І ганіце прэч набыты, не прыродны, а чалавечы, страх. А я, як бы ні рухалася далей мая «справа», я разам з вамі...

... І ніколі ня кідайце ў сьметніцу хлеб! А піва выпівайце да дна.

**СЛАВАМІР**

---

*Ганна Матусэвіч*

## Койданаўскі дыярыюш



15.06. На двары — вецер і сьцюжа. У душы — восень і золь.

16.06. Эх, надаела-надакучыла мне гэтая «нэндза зь сівой галавою»! Так шляхетна велічае мая мама Купалаву «крыўду з лапцямі». Неяк бачыла ў сьне (а ці праўда, ці не?) хадзіла па сьвеце некалі высокая мажная арыстакратка пры дамскім капялюшыку з тоўстымі лыткамі-каленамі. І гэтая жанчына была я, хоць яна — самое непадабенства да мяне. Мабыць шпурлялася багацейка грашыма ўлева-ўправа-ўзад-уперад, бо мне цяпер за колішняе марнатраўства даводзіцца разьлічвацца.

17.06. «Будзеце глядзець — і ня будзеце бачыць; будзеце мець вушы — і ня будзеце чуць», — сказана, як быццам толькі ўчора. А сёньня ў адказ на мой «добры дзень» нашая старэнькая вясковая «Божанька» моцна дакарала мяне: «А не зарабіла ты «Пахвалёны Езус», не зарабіла!» Ну чым усьцешыць гэтую згорбленую да самай зямлі руплівіцу? Хіба чыстай праўдай, што не зарабіла...

18.06. Гэта што: лёс мой такі? Зьявіцца на гэты сьвет непрыгожай жанчынай, якая мусіць бараніць сваіх шматлікіх каханых мужчынаў і зусім не набівацца, аднак, у іхнюю каханку.

19.06. Бяда, калі засьпіць жанчына! Зь ёю засыпае ўвесь сьвет.

20.06. Учора, калі па драбіне залазіла ўжо на сена спаць, сустрэлася позіркамі на вышыні, як роўная з роўнымі, з двума старымі клянамі. Дрэвы абдымаюць старую Гарбузішыну хату, якая пазелянела ад іхняга ўплыву. Абодва старыя па-старамоднаму пакланіліся мне. Я папыталася ў іх, каго яны ахоўваюць тут, калі іхняй гаспадыні ўжо няма на гэтым сьвеце... Яны прашумелі мне ў адказ нешта, чаго я пакуль не магу зразумець. А сёньня я зьбірала ў лесе чарніцы і шмат думала пра старыя клёны...

21.06. Будзённая руцінная праца на зямлі не дае мне магчымасьці выпрастацца й паглядзець на Неба.

22.06. «Духовай засухай» называецца такі стан душы, калі сьвядомасьць узьнеслася высока, а цэнтры яшчэ ня могуць прыстасавацца. Я пакутліва шукаю, у чым мая сьвядомасьць можа выказаць сябе. Але я ўжо ведаю, што гэткі стан часовы, і тое, чаго я ня ведаю сёньня, я магу ведаць заўтра.

23.06. Ну вось, хоць Славаміру я дапамагла, і той падзякаваў за дапамогу! А то абрыдзела ўжо за помач увесь час атрымліваць кухталі.

У Адамовіча — зрухі, хоць ён і знаходзіцца яшчэ ў рэанімацыйным аддзяленьні шпіталя КДБ. Па-першае, мабыць, пачуўшы пах прысмакаў з маёй торбы, ён сёньня перапыніў галадоўку. Жартую, бо для гэтага ёсьць сур'ёзная падстава. І гэта па-другое, што яму трэба рыхтавацца да судовага працэсу. Адвакат Паганяйла бярэцца яму дапамагаць. Справу сьледчы закрыў. Па-трэцяе, я радая, што ён не сядзіць больш у няведаньні, а «поўны інфармацыі, ёсьць і вершы», хоць мне і не ўдалося аніякім чынам выцыганіць іх для сябе. «Хутка вершы пабачаць сьвет» дзеля ўсіх. Па-чацьвертае, ён напісаў мне, што апроч маці й рэдактара, у яго былі Клыкоўская ды яшчэ адна жанчына. Напісаў, бо мяне не пусьцілі да яго ў палату. А не пусьцілі таму, што ў мяне не хапіла сьмеласьці схлусіць, што я — ягоная былая жонка. Праўда, я ўдзячная лекарам-кэгэбістам за іхнія звышасьцярожныя захады ў дачыненьні да маёй сьціплай асобы, бо ў выніку на памяць аб несустрэчы з паэтам у мяне застаўся Славаміраў «Ліст з-пад суда» (назва мая).

НАША НІВА 1 ліпеня 1996 № 16 (54)

Сяржук Сокалаў

# Плябеі

**1**

Маё сяло — адсталае сяло:
Клубок цямноцьцяў, згустак прымітываў,
Таму ў жыцьці вяскоўцаў не было
Ані сьпіраляў, ні прэзэрватываў.

Засьцерагальны сродак: процігаз —
Ім недасяжны — быў у брыгадзіра,
Вось вам і рос, і шырыўся калгас —
Адзіны плюс! Ва ўсім астатнім — дзіра.

Ледзь толькі Сонца — шась! за далягляд,
У ложак продкі клаліся адразу,
Але ня з мэтай справіць сакалят,
А з мэтай неяк заашчадзіць газу!

Ды і пазьней, пры лямпе Ільліча,
Трымаліся традыцый — нараджалі
Ня сунулі ў электрыку лыча
На ўласным прасьвятленьні ашчаджалі.

А Бог даваў, і большала радні:
Куды ні глянь, там — Сокалаў, там — Воюш,
І кожны зь іх пускае карані,
Расьце й буяе так, што не прымроіш!

Ды раптам сьвет кульнуўся дагары
Зваліўся лад сыстэмы шматпудовай,
Было начальства, сталі — змагары
І па сялу пайшлі зь «перабудовай».

Як так, дык так. І мы за лепшы лёс,
Між нас таксама лідары і воі.
Сымболем волі брыгадзір з калёс
У Ленінскі пакой прынёс «Плэйбоі».

Жанчыны ў сьмех, мужчыны ў
— хвост трубой,
Дзяды й бабулі цэлы дзень плявалі,
Але дадому кожны ўзяў з сабой,
Чаму ж ня ўзяць, калі дарма давалі.

І вось у хатах, першы раз за век!
Сьвятло праз ноч гарэла да сьвітаньня —
Да зданяў, да распухласьці павек
Апанаваў вяскоўцаў шал чытаньня...

**2**

Сусед рукою пляснуў па стале:
— Усё зь сябе! — сказаў сваёй кабеце,
— Хоць раз зірну на жонку пры сьвятле:
Ці так усё, што ў іншых баб на сьвеце!

Кабета:
— Не! Але, вядома — муж...
Ляцяць на дол аборкі і завязкі,
Апошні гузік, як апошні гуж
Упарціцца ў цянётах пальцаў вязкіх...

— Сказаў усё! І сподняе далоў!
А цешча хай рыхтуецца таксама!
— Ты звар'яцеў!
— Давай бязь лішніх слоў!
— Ня руш старой!
— А я сказаў: і ма–а–ма!

Чаго стыдацца? Глянь на тэй «Плябой» —
Не загарнуць. Перашкаджаюць грудзі!
А задніца! І ўсё перад табой!
А... гэтыя... паглянь... Жывуць жа людзі!

— Яны ж за грошы. Там жа — капітал!
А тут — гарод і сьмешная палучка,
То — фронт работ, то — бітва за мэтал...
Ня буду распранацца! Што я — сучка?!

На стан жаночы пырснулі яны —
Дзьве поўні на паставе гнуткіх шаляў.
І нават качаны ды кавуны
Ля іх як неданоскі выглядалі.

Два келіхі каханьня і жыцьця —
Ня выпіць іх, ня вычарпаць да скону...
Адзіны хто — сысучае дзіця
Апаражняе гэтую бяздону...

Пакуль мужык глядзеў разьняўшы рот,
Пакуль адчайна цёр рукамі вочы,
Я вырашыў укінуць слоўны шрот
У хваласьпеў — у гімн грудзям жаночым!

**3**

Не хуліган, не скандаліст,
За столькі год жыцьця (О, Божа!)
Са стажам нацыяналіст,
Ня зьведаў я грудзей варожых.

Лепш выкінь гной з хлява, ці плот папраў,
Ля хаты непачаты край работы!
А той «Плябей» ідзі аддай, дзе браў.
Захочаш глянуць зад — чакай суботы,

Напалім лазьню... Чарачку кульнём.
Тады й глядзі павылупіўшы вочы.
— Э, не, старая. Пры сьвятле, ці днём!
Я ў лазьні пры газьнічцы не ахвочы!..

Куды далей цягнуўся перабрэх? —
Ня чуў, ня знаю, толькі ў крыку й гвалце
Здалася цётка і сказаўшы: — Грэх...
Рукой дрыжачай скінула бюстгальтар...

Фатограф — склюд... Рэдактар — ліхадзей...
Паэт — казёл... Якія там бутоны?
Сусьвет прыціх
ля россыпу грудзей,
Як ядзершчык ля
бомбы
кілятоннай.



Хаця трапляліся і мне
Мурынкі, зьмешкі, азіяткі,
Але з кароткім словам «не»
Я ціснуў кожны раз на пяткі.

Таму пра іншых не скажу,
Рукой ня меў, а вокам мацаў
З увагай грудзі розных нацый.
(Такой бы пільнасьці віжу!)

І мне ўдалося зразумець
Сакрэт ня кволы і ня зрэбны:
Што мала проста грудзі мець
Што іх умець насіць патрэбна.

Бывае, грудзі менш ад сьліў
Ляжаць у ліфіку закопам,
Здаецца, хто б ні загаліў —
Ня знойдзе нават зь мікраскопам!

А вось жа выйдзе: шык ды густ,
Паходка, лінія раменаў...
І грудкі — грудзі! Нават — бюст!
Для нашых позіркаў замглёных.

Сябе самога не змагчы
І толькі тым свой стрэс здымаеш,
Што з асалодай уначы
Ты іх як райскі плод трымаеш!

За тым, на доўгія гады,
Калі удача йдзе абмінам,
Трымценьне грудак маладых
Табе найлепшым успамінам.

Але бываюць у жанчын
Такія грудзі — мнагатонкі,
Што кожны раз, бяз дай прычын,
Зь любой апраткі лезуць вонкі.

Часамі думаецца мне:
І ў броні рыцарскіх дасьпехаў,
Як гаспадыня апране,
Яны б знайшлі сабе прарэхаў.

Таму, ізноў жа: як насіць?
Як падаваць вачам сустрэчным?
Ці проста плюнуць: хай вісіць?
Ды лезе з сукні недарэчна?

Ці ўсё ж паслухаць голас мой:
Калі нясуць жанчыну грудзі
Калі яны кіруюць ёй —
Нічога з гэтага ня будзе...

Яна павінна несьці іх
І кіраваць такім аб'ёмам,
Каб нам застаўся толькі зьвіх
Ды прага стрэчаў пакрыёма...

**4**

Аднак жа вернемся ў калгас,
Дзе зраньня ў Ленінскім пакоі
Адукаванай часткай мас
Назад здаваліся «Плэйбоі»

— У нас спрытнейшыя жанкі, —
Дзядзькі прыцішана гудзелі, —
Каб тых да нас на дзень які
Яны б — ого як замадзелі!

— Не перад камэрай малоць
Сваім пялегім гладкім задам.
— Кароў даіць, гарод палоць,
Апратку мыць, глядзець за садам.

— А потым вас п'яных насіць
Да хаты з розных пагулянак
І не стагнаць, не галасіць,
Не выглядаць на абадранак.

— З таго «Плябея» ні адна
У стог ня пойдзе спаць з мужчынам...
— І што ні баба, то — мана,
І сухарэбрына — ляшчына.

— Каб ім, ды крышачку вагі
А да вагі хоць нейкі розум,
Схадзіў бы зь імі я ў стагі
Хаця б і быў той дзень цьвярозым...

Затым пайшлі часопіс ксьціць,
Усе, хто браў з прыцэлам дальнім:
— Ні самакруткі не скруціць...
— Ні скарыстаць у прыбіральні!

**5**

Я вырас сам у тым сяле,
Таму вяскоўцаў добра чую
І крытыкнуў бы іх, але
Мяркую: лепей памаўчу я.

Бо, што язык аб зубы біць,
Нашто глуздам даваць нагрузку...
Я ўмею, што зь любой зрабіць,
Але, пардон, па-беларуску.

І калі нешта там ня так
І хтось з адчаю ўпаў у кому,
То — можа быць, што лепей: фак,
Ды я ня вучаны такому.

Затое вучаны змала
Ня даўца змогам і паразам...
Ну а пра сэкс майго сяла,
Я раскажу наступным разам.

# Прыгожыя «хулігана»

Ну добра, выкажу я табе пару думак наконт кніжкі «Толькі не гавары маёй маме...»...

Такі пачатак нататкі цалкам апраўданы, калі йдзецца аб інтымнай прозе Адама Глёбуса. Глёбус быццам не навязвае свой інтым чытачу, амаль кожная «кароткая аповесьць пра...» гэтага зборніка пачынаецца праз уяўнае «уламваньне» аўтара чытачом.

Глёбус — хуліган. Гэткую фразу выдаў адзін мой знаёмец, калі прачытаў «Толькі...». Я яго зразумеў. Хуліганства Глёбуса — у ягонай здатнасьці падаваць чытачу «нясмачныя» рэчы, захоўваючы густ і «літаратурнасьць». «Нясмачнасьць» можа «завязнуць» у зубах, але не прычэпісься — тэкст зроблены якасна. Гэта выТВОРЧАСЬЦЬ высокае клясы. Кніжку «Толькі...» немагчыма любіць ці не любіць, яе можна чытаць ці не чытаць. Я прачытаў.

У зборнік увайшлі сем аповесьцяў і два кароткія раманы «пра...» розныя рэчы: «першае каханьне», «гідкасьці», «суперажываньне», «лю-

Адам Глёбус

# Каралеўства Буды

*тайляндзкія падарожныя сьпісы*

Пачатак у №10-15

## Гідкае...

Маленькія, толькі народжаныя ружовыя вожыкі зь мяккімі белымі іголкамі. Вельмі гідка выглядаюць. Можа, каб іх не чапалі?

Вулічны п'янаваты кухар з рыбнымі стравамі — гідкі. Якім трэба быць галодным, каб у яго нешта купіць? Купляюць і ядуць, і ўсьміхаюцца. Азія.

## Тое, што нагадвае пра мінулае, але канчаткова страціла каштоўнасьць...

Мапы далёкіх гарадоў, дзе быў у юнацтве. Назвы вуліцаў, пляцаў зьмяніліся. Нават імёны саміх гарадоў іншыя. А вось захоўваю тыя пажоўклыя мапы.

Бірка, зробленая з цыраты й бінта, якую прывязалі да маёй рукі ў радзільным доме. Яе разам з залатой манэткаю перадала маці на трыццацішасьцігодзьдзе, сказаўшы: «Болей падарункаў рабіць ня буду».



Лісты ад каханак, ад сяброў з войска, фотакарткі памерлых далёкіх сваякоў захоўваю у найглыбейшай скрыні. Зьнесьці іх на сьметнік не стае мужнасьці, яны дарагія, як успамін.

## Жудаснае...

Фільмы пра Пол Пота й чырвоных кхмэраў выклікалі ў мяне жудаснае пачуцьцё. І ў Тайляндзе я заўсёды помніў, што на поўначы каралеўства жывуць тыя самыя кхмэры, якія капачамі праломвалі галовы сваім бацькам. Наагул, дакумэнтальныя фільмы пра вайну й гвалт пакідаюць жахлівыя ўражаньні. Асабліва мяне ўсхвалявалі кадры з Ічкерыі... На зялёным падворку перад спаленым хлеўчуком стаяла белае маленькае ягнятка, анёл божы, а сьпіна ў жывёлы была чорная, рудая, абпаленая. Зьявілася жаданьне зрабіць фільм пра лёс жывёлаў на вайне. Каб чалавецтва пабачыла жудасьць уласных учынкаў на бойні. Толькі кіно — форма апраўданьня, а апраўданьня зьнішчэньню жывёлы няма. Кіно ня зьняў.

Мора ў бязьмесячную ноч мае жудасны выгляд: варушыцца й шуміць ўсёпаглынальная цемрадзь.

Задворкі хмарачосаў у Бангкоку — жудасныя карціны. Сярод сьмецьця сядзяць на кукішках людзі, пякуць на агні марскіх пачвараў і жаруць іх.

Плод дурыяну падобны да вялізнага каштану ў зялёнай іклястай абалонцы. Сярэдзіна ў яго жоўта-ружовая, смакам нагадвае трускаўкі. Але скура такая сьмярдзючая, што ў гатэль плод заносіць забараняецца. У фае вісяць знакі накшталт «сабака-stop», толькі замест сабакі на знаку намаляваны дурыян.

Сэрца сьціснулася, калі паслухаў апавяданьне спадарожніцы пра водныя матацыклы — скутары... «Прыехалі мы ў Турцыю, у Анталію. Хлопцы выпілі, узялі скутары й пачалі гойсаць па хвалях. Два скутары на ўсё мора. Я якраз пайшла па колу. Вяртаюся. Чую крыкі. Я бягом. Прылятаю... Адзін з матацыклістаў ляжыць пасярод пляжу ўвесь мокры і ў пяску. Жвір у



носе, у вушах, у роце... Руль прабіў яму грудзі. Рэбры ўвайшлі ў лёгкія. Хлопец захлынуўся ўласнай крывёю. І душа ў Бога. Два матацыклы на цэлае мора, і аварыя. А другога ў паліцыю забралі, судзіць за забойства. Я падумала: капец і другому ў турэцкай турме. А вось і не. Аналіз паказаў, што ён быў цьвярозы, а нябожчык п'яны. Мы выступілі як сьведкі, што нябожчык сам ня зладзіў з кіраваньнем. Суд апраўдаў забойцу, ён, дарэчы, і труну зь сябрам у Менск прывёз».

У апавяданьнях пра самую жорсткую ў сьвеце тайляндзкую турму радасьці няма. Там беламу ня знойдзецца месца ў ценю. Там белы будзе есьці толькі апошні. Там беламу ў першую ноч паломяць, пераломяць, выб'юць усё, што можна, каб адно не памёр у першую ноч. Там жыцьцё нічога не каштуе.

Паляк Янэк, які пражыў у Бангкоку дзесяць гадоў, выказаўся так: «Жыцьцё ў Азіі нічога не каштуе».

Тайлянцы прастадушныя, як дзеці, але й жорсткія, як дзеці.

Зьмяіныя клубкі ў рэальнасьці мне ніколі не траппяліся, але ўяўленьне пра клубок, які сыкае, спараджае халодную жудасьць.

Магіла ў пэўны момант можа выклікаць жудаснае пачуцьцё. Выкапалі яе. Яміна як яміна. Ня першая, не апошняя. Вось мужчыны падсаджваюць адзін аднога, вылазяць. І абавязкова нехта аб'едзе назад. Пясок пацячэ ў яму. Сэрца спыніцца. Усе там будзем. І час той блізка.

Усялякія норы ў лесе патыхаюць жудасьцю. Ведаеш, той ліс баіцца цябе да разрыву сэрца, а ўсё адно палохаесься акруглай чарнаты.

Папараць, асабіста ў мяне, выклікае жудасьць. Пад ёй хто заўгодна і што заўгодна можа схавацца. Колькі разоў было: разгорнеш лісты, каб зрэзаць чырвонагаловіка, а там гадзюка галаву ўздымае, сіпіць. І чаму ў Беларусі папараць-кветка ўвасабляе шчасьце? Зьдзек нейкі жудасны.

Вялікая сума наяўных грошай выклікае жудасьць. Гэта ў дурнаватых кінакарцінах радуюцца цацкам накшталт чамаданчыка з грашыма. Жыцьцё — ня казка, заб'юць — не ўваскрэсьнеш.

Ільдзістая зьмяя жудасьці выпаўзае са страўніка й спыняецца ў горле, калі абрываесься з вышыні. Крык падчас падзеньня — гэта голас жудасьці.

## Зьняважлівыя словы...

Іх можна пачуць ад палітыкаў, ад п'яных працоўных, ад тэлеаглядальнікаў і ад самога сябе, апошнія — самыя брыдкія.

## Чорнае...

Імчуся ўночы па Бангкоку на мота-рыкшы. Бачу на скрыжаваньні такога ж мота-рыкшу. Толькі ў кодабе замест пасажыраў ляжыць бліскучая, лякаваная доўгая труна. Проза. Ноч. Чырвоны сьветлафор. Чорнае века труны. Насупраць мяне ў кодабе сядзіць сутэнэр з парваным ротам.

Вобразы ў дзіцячых жахлівых апавяданьнях збольшага маюць цёмную й чорную сутнасьць і афарбоўку: Чорная рука, Чорная пальчатка, Чорная нітка, якая душыць немаўлятак у калысках, Чорны кот, Чорны пакой, Чорны дом...

Адназначны радыкальна-чорны колер мае кропка.

Нагавіцы афіцыянтаў у рэстарацыях мусяць быць чорныя. Дарэчы, ролікавыя канькі, на якіх каталіся афіцыянты ў Бангкоцкай рэстарацыі, мелі плястыкава-чорную сутнасьць.

У знаёмай Касі я бачыў упрыгожаньні з так званымі чорнымі пэрлінамі, прывезенымі з Каралеўства Тайлянд, яны мяне зусім ня ўразілі, бо не былі чорныя, а мелі шары, брудны колер і сьлізкаватую фактуру балотных беларускіх апалонікаў.

## Нічога ня вартае...

Сябар, які перастаў разумець твае словы.

Кніга, якую ўпусьцілі ў мора.

## Сумнае...

Сумна праводзіць вечары без каханай жанчыны.

Вельмі сумна вечарамі ў правінцыі, калі прывык да шпацыраў у сталіцы.

Заляцаньні малапрыгожай распусьніцы спачатку выклікаюць раздражнёнасьць, а потым сум.

Увага лісьліўца — сумная зьява.

Самае сумнае на сьвеце — упэўніцца, што родныя болей ня любяць цябе.

Сумныя настроі лёгка разгоняць тэленавіны, толькі ў гэтым разе лепей крышку пасумаваць.

Кніга пра экзатычныя падарожжы таленавіта разьвейвае хмурынкі суму.

Не засумуеш і з жанчынаю, якая здатная падтрымліваць размову.



Сумна заўважаць праявы старасьці: сівыя валаскі, зморшчынкі, хуткую стому. Яшчэ больш сумна назіраць за людзьмі, што імкнуцца падмануць сябе: апранаюцца неадпаведна ўзросту, вольны час ахвяруюць толькі на амаладжэньне. Хто спрачаецца, трэба глядзець сябе. Толькі сумна бачыць, як пяцідзесяцігадовая кабета сур'ёзна замаскавалася пад пятнаццацігадовую дзяўчыну. Яна не разумее, што менавіта ў такім варыянце найлягчэй вызначыць яе ўзрост.

Каб не сумаваць з-за незваротнай плыні жыцьця, дастаткова выглядаць крышку лепей за сваіх аднагодкаў.

## Малпаваньне...

Гарадчукі малпуюць сталічных жыхароў, местачкоўцы малпуюць гарадчукоў, вяскоўцы перамалпоўваюць местачкоўцаў, а элітная частка сталіцы, каб стварыць вечны рухавік малпаваньня, перамалпоўвае паводзіны вяскоўцаў.

## Шарае...

Шары мусіць быць попел.

У антыкварнай краме на статуэтцы Буды сядзеў маленькі шары матылёк. Я паказаў яго жанчыне-гандлярцы, на што тая прамовіла: «батэрфляй!» «Мадам-Батэрфляй?» — паспрабаваў пажартаваць я з маладой тайляндкаю. «Ноў, ноў, ноў!» — гандлярка ажно адступіла на некалькі крокаў. Давялося хуценька пакінуць краму, дзе на залацістым Будзе застаўся адпачываць шары батэрфляй.

Шарай мусіць быць гадзіна. Хоць бы раз на дзень, хоць бы на некаторы час, але ўсё існае зьліваецца ў адзіны суцэльны спакой. Што можа быць лепшае за цішыню шарай гадзіны? Толькі мара пра наступную шарую гадзіну.

## Масты...

Мост, па якім едзеш.

Мост, пад якім праяжджаеш.

Мост, на які глядзіш з-пад моста, пад якім праяжджаеш, едучы па мосьце.

*Бангкок — Менск, 1995-1996.*

# «нясмачнасьці» Глёбуса

**СЕВЯРЫН КВЯТКОЎСКІ**

тасьць» і інш. Як для мяне, яны вабяць чытача найбольш праз тое, што ён ведае пра інтымнасьць-«дакумэнтальнасьць» твораў.

Самыя моцныя ўражаньні — дзіцячыя — ніколі не пакідаюць чалавека, наадварот, яны ёсьць базыснымі для разьвіцьця асобы. Таму любы тэкст аб тым, «як я быў маленькім», заўжды прыцягвае да сябе ўвагу. Таксама вабяць людзей аповеды пра «першае» —каханьне, расчараваньне, расстаньне etc. На мой погляд, найбольш выйгрышныя ў «Толькі...» тэксты зь сюжэтамі з ранььяга пэрыяду жыцьця Адама Глёбуса. Калі ўзяць «раман пра зьдзіўленьне» «Толькі не гавары маёй маме...», дык ён асабіста мяне не «зачапіў», гэта падарожныя замалёўкі, клясна літаратурызаваныя. То бок, я іх з задавальненьнем прачытаў, але ня ў якасьці прозы. Для мяне галоўная каштоўнасьць тэкстаў Глёбуса — у іхняй відарыснасьці. Па-мойму, «Толькі...» — гэта зборнік інтымных сцэнараў кароткіх фільмаў «пра...».

# Фэномэн маладога пакаленьня

*Інтэрвію кс. Люка Парэйта, галоўнага рэдактара францускага часопіса «Croire aujourd'hui» («Верыць сёньня»)*

**— На тое, што перадаваць уласным дзецям веру цяжка, бацькі пачалі скардзіцца ня ўчора. У чым тут цяпер галоўная перашкода?**

— Цяжка перадаваць веру, жывучы ў падвешаным стане паміж мінуўшчынай, у якой мы ня можам або ня ўмеем знайсьці апірышча, і будучыняй, якая нам невядомая.

Мне здаецца, што зьменнасьць культуры, у якой мы жывем, уплывае нават на самыя глыбокія рэлігійныя перакананьні, ускладняючы перадачу веры. Цяжка падабраць дакладныя словы, бо мы ўжо ня ўпэўненыя ў значэньні словаў. Нават і сам будынак царквы не вылучаецца на тле атачэньня так, як калісь.

Клімат няпэўнасьці, які пануе цяпер, нараджае сутаргавыя памкненьні самаабароны, пошуку аксыёмаў і трыманьня знойдзенае рэлігійнае тоеснасьці. Як у такім клімаце даць маладым прастору для ўласных пошукаў, дазволіць, каб яны сваім шляхам адкрывалі перададзенае ім рэлігійнае пасланьне? Наадварот, усё маніякальна коціцца ў бок замыканьня, закручваньня шрубоў. Такім чынам мы аддаляемся ад лёгікі Эвангельля, якая ёсьць лёгікай свабоды: «прыйдзіце і ўбачыце»...

Трэба, аднак, падкрэсьліць, што гэта ня толькі праблема царквы. Цяжкасьці зь перадачай чагосьці ад пакаленьня да пакаленьня датычаць таксама сьвету палітыкі, школы і шмат іншых галінаў жыцьця.

**— Ці ёсьць падставы для надзеі?**

— Перадаваньне веры мусіць адбывацца на партнэрскай аснове. Мы не павінны разглядаць розум і сэрца маладых як пустое начыненьне, якое мусіць цалкам напоўніцца тым, што перадаюць бацькі. Пераклад досьведу на зразумелую для маладых мову вымагае супрацоўніцтва пакаленьняў. Ніхто пры гэтым ня можа сьцьвярджаць, што канчатковае будзе ягонае слова. Веру трэба перадаваць не праз выкладаньне навук, але праз супольную навуку і супольнае шуканьне адпаведных словаў.

Урэшце, трэба мець адвагу супольнага сьведчаньня. У адрозьненьне ад папярэдніх пакаленьняў, сёньняшнія маладыя адкрытыя для такога спатканьня і партнэрства. Але яны ня хочуць прымаць гатовага бачаньня сьвету.

На маю думку, маладыя алергічна рэагуюць на ўсялякія «стратэгіі», асабліва ў галіне рэлігіі. А царква надалей думае пра маладых у такіх катэгорыях.

**— Ці не стаім мы перад першым выключна «гуманістычным» пакаленьнем?**

— Згода. Упершыню мы дачакаліся пакаленьня, якое да такой ступені прыўлашчыла сабе ідэі свабоды, роўнасьці, можа, у меншай ступені, братэрства. У гэтым сэнсе сёньняшнія маладыя — гуманісты. Ці значыць гэта, што яны вызваленыя ад царкоўнага ўплыву? Напэўна, не. Мы дачакаліся пакаленьня, якое мае магутныя духовыя патрэбы, пра што сьведчыць папулярнасьць сэктаў і частае кіданьне ад адных духовых прапановаў да іншых.

Можна толькі зьдзіўляцца, што моладзі з такімі моцнымі маральнымі памкненьнямі вельмі цяжка зарганізавацца. Кожнае заангажаваньне вымагае трансцэндэнцыі. Ня толькі ў рэлігійным сэнсе гэтага слова, але таксама трансцэндэнцыі, як маральнага і філязофскага грунту, які дазваляе пераступаць часовую пэрспэктыву, каб бачыць далей. Такой трансцэндэнцыі сёньняшняй моладзі не стае. Яна мае ў ёй моцную патрэбу, якую нам не заўсёды ўдаецца задаволіць. Нам цяжка адрозьніць рэлігійную патрэбу ад духоўнай. У царквы ёсьць спантанная схільнасьць, каб вытлумачваць такую патрэбу прагаю веры. Такім чынам мы інтэрпрэтуем патрэбу быцьця разам і супольнай малітвы, якая ёсьць асновай вялікіх сходаў, тады як у большасьці выпадкаў гутарка ідзе пра зусім ня гэтак адназначна акрэсьленую патрэбу.

**— Ці дойдзе калі-небудзь да злучэньня маральнага навучаньня царквы і маладзёжнага стылю жыцьця?**

— Найперш трэба ўнікаць меркаваньняў пра немаральнасьць моладзі. Нават іх сэксуальныя паводзіны наагул больш стрыманыя, чым у папярэдняга пакаленьня. Яны зьдзіўляюць дарослых сваім раманытызмам, той вагою, якую надаюць вернасьці.



Не рызыкну назваць іх «маральным пакаленьнем», але назаву пакаленьнем «разважным», уцягнутым у вялікія этычныя спрэчкі. Трэба, аднак, прызнаць, што нам цяжка бывае паразумецца, і што яны надаюць іншае значэньне розным словам, такім, як, напрыклад, маральнасьць, якая гучыць у іхніх вушах як сынонім «прымусу».

Думаю, што са свайго боку царква мусіць перагледзець сваю антрапалёгію альбо вобраз чалавека, які ляжыць у аснове яе маральнага дыскурсу. Яна мусіць быць асьцярожная ў выбары словаў, якія ўжывае, мець адвагу і цярплівасьць, каб грунтоўна аналізаваць кожную сытуацыю перад тым, як выказацца пра яе. Мы гэтага ня робім. Колькі мы кажам пра пачуцьцёвае або сэксуальнае жыцьцё моладзі і не абавязкова моладзі? Асабіста я не згаджаюся на азначэньне «культура сьмерці». Гэта жорсткі прысуд тых, хто спрабуе дакладна вызначаць свае пазыцыі і меркаваньні ў галіне, да якой ніхто ня мае адназначнага ключа.

Часам я мару пра энцыкліку, што складалася б з пустых старонак, якім папярэднічаў бы ўступ з гэткімі словамі: зьбярэм ідэі, словы, досьведы, а калі сшытак будзе поўны, убачым, як мы можам гэта ўсё разам спарадкаваць і адрэдагаваць.

«LA VIE»

# Страчаная спадчына




*Зьнішчэньне выбітных помнікаў цягнула за сабою і разбурэньне ўсяго ўрбаністычнага асяродзьдзя, у якім яны існавалі, а разам зь імі зьнікала апрача высокае культуры. Людзі, якія жылі на пачатку нашага стагодзьдзя, стваралі і чыталі «Нашу Ніву», дыхалі зусім іншым культурным паветрам, дзе было месца сівой традыцыі, натуральнай талеранцыі, веры ў вялікія творчыя сілы народу, які мог ствараць невымоўнае хараство і ўмеў ім даражыць. Зьнішчэньне спадчыны пацягнула за сабою амаль непапраўныя вынікі — зьнявераньне ў Бога і ў самых сябе, цынізм і нябачанае раней ахаменьне цэлых пакаленьняў. Нагадваючы пра нашыя культурныя страты, мы напрыканцы стагодзьдзя гукаем новую культуру. Мы ўжо йснуем нанова...*

*Гэта апошні, пяты здымак нашага конкурсу. Пытаньне тое самае: што гэта за сьвятыня і ў якім годзе яна была зьнішчаная? Зараз нам засталося прычакаць адказаў. Нагадаем, мы па-ранейшаму чакаем на вашыя допісы, магчыма, рэфлексіі, развагі, якія могуць выклікаць у Вас тыя здымкі, якія мы выкарыстоўваем для конкурсу. Актыўных удзельнікаў конкурсу, як і мінулага, чакаюць прэзэнты: падпіска на «Нашу Ніву», кнігі, якія былі падрыхтаваныя нашай рэдакцыяй. У наступным нумары — адказы... і працяг нашага конкурсу загадкаў, прысьвечанага дзевяностагодзьдзю "Нашай Нівы". Сачыце ўважліва за нашымі публікацыямі!*

С. ХАРЭЎСКІ




© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5000 Нумар падпісаны ў друк 30.6.1996 Надрукавана ў ЗАТ "Lietuvos Rytas" (Вільня, праспэкт Гедыміна, 12а)